Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 ЖНІЎНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 147 (27512) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Любое гучнае прызначэнне жанчыны на кіруючыя пасады суправаджаецца інфармацыйным выбухам. Не стала выключэннем і навіна пра 22-гадовую Ганну Болбас, якая ўзначаліла футбольны клуб «Партызан». СТАР 6

Надвор'е — адна з асноўных тэм для размоў. І мала хто задумваўся, што гэта не толькі падстава завязаць гутарку, але і адзін з фактараў, якія адыгралі немалаважную ролю ў гісторыі краін і цывілізацый. СТАР 8

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАДТРЫМАЎ КАНЦЭПЦЫЮ РАЗВІЦЦЯ ІНВЕСТЫЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падтрымаў канцэпцыю развіцця інвестыцыйнай дзейнасці ў Мінскай вобласці. Адпаведныя пытанні абмяркоўваліся 8 жніўня на рабочай сустрэчы кіраўніка дзяржавы са старшынёй Мінаблвыканкама Барысам Батурам.

Прэзідэнту даложана аб развіцці інвестыцыйнай дзейнасці на тэрыторыі Мінскай вобласці і ўнесены шэраг прапаноў па рэалізацыі асобных інвестпраектаў. Падтрымаўшы канцэпцыю ў цэлым, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што зямельныя ўчасткі, асабліва на падставе дэкрэта № 10 «Аб стварэнні дадатковых умоў для інвестыцыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», неабходна прадастаўляць толькі пад стварэнне высокаэфектыўных вытворчасцяў.

Усяго ў Мінскай вобласці рэалізуецца амаль 350 інвестпраектаў у вытворчай сферы.

Яшчэ адной тэмай рабочай сустрэчы стала ўборачная кампанія. Як далажыў губернатар, перад аграрыямі сталічнага рэгіёна стаіць задача максімальна хутка яе завяршыць, пакуль гэтаму садзейнічаюць умовы надвор'я. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на неабходнасць няўхільнага выканання тэхналогій уборкі і забеспячэння якасці.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Анатоль НІЧКАСАЎ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:

«РАІЦЦА З ЛЮДЗЬМІ!»

Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва пераглядае будаўнічую палітыку, якая не зведвала істотных змен з 1990 года. Да канца жніўня будзе зацверджаны прынцыпова новы законапраект, які замацуе іншыя падыходы ў плане цэнаўтварэння, мадэрнізацыі і кантролю за якасцю. «У першую чаргу спросцяць арганізацыйную сістэму, наладзіўшы прамую сувязь паміж інвестарам і генеральным дырэктарам», — паведамляе міністр.

Тым часам разглядаецца пытанне існавання прамысловых прадпрыемстваў у гарадах. Ужо абмяркоўваецца перанос заводаў з цэнтраў і спальных раёнаў на перыферыю. Калі акцэнтаваць увагу на Мінску, то справа датычыцца ў першую чаргу завода імя Кірава і забудовы ў раёне Якуба Коласа.

Міністр зазначыў, што грамадская думка будзе ўлічвацца: «Пры фарміраванні планаў будаўніцтва неабходна раіцца з людзьмі». Апошнім часам Мінскі гарвыканкам выявіў факты, калі грамадскае абмеркаванне мела чыста фармальны характар або не праводзілася ўвогуле. Паводле слоў Анатоля Нічкасава, такога быць не павінна, паколькі будаўнічая палітыка краіны арыентавана на на кожнага беларуса. Таму ў бліжэйшым будучым — разгляд нарматыўнага дакумента пра грамадскае абмеркаванне. Ён мае патрэбу ў значных папраўках.

Анатоль Нічкасаў адказаў на пытанні пра цэнаўтварэнне. Варта нагадаць, што цана будаўнічых матэрыялаў залежыць ад дынамікі цэн у сумежных галінах. Так, дарожныя расходы павялічваюць кошт ад трох да пяці з паловай разоў: дабыўшы сыравіну, яе неабходна прывезці, а пасля гатовы будаўнічы матэрыял трэба зноў перавозіць. У цэнаўтварэнні далёка не апошнюю ролю выконваюць затраты на заробкі. Сёлета яны склалі 26% ад канчатковай сумы.

«Указ №361 даў магчымасць прарыву ў разліку цэн. Калі раней сістэма індэксацыі ўскладняла разлікі, то цяпер дзейнічае рэсурсны метад цэнаўтварэння», — канстатуе міністр. Што гэта значыць для нас? Раскруткі цэн на адзін квадратны метр не будзе, істотна знізіцца кошт будаўнічай прадукцыі. Маніторынг росту заробкаў і кошту будаўніцтва паказвае фактычную адсутнасць раскруткі цэн. Кошт аднаго квадратнага метра застаецца роўным сярэдняму месячнаму заробку беларуса. СТАР 2

ГОЖАЯ, ЗДАРОВАЯ — УСЯ БЕЛАГАЛОВАЯ!

Фота БЕЛТА.

Больш за 50 тон ранняй капусты адправілі ў гандлёвую сетку агароднікі прыгараднага сельскагаспадарчага вытворчага кааператыву «Альгоўскае» Віцебскага раёна. Усяго сёлета яны плануюць сабраць каля тысячы тон капусты.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЯКАБСОН, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю:

«Узвядзенне жылля, аб'ектаў сацыяльнай і прамысловай інфраструктуры падчас падрыхтоўчага этапу будаўніцтва Беларускай АЭС з'яўляецца станоўчым прыкладам для астатніх беларускіх будаўнікоў. Патрабаванні па якасці і тэрмінах па ўсіх убачаных намі сёння аб'ектах цалкам выкананы. Гэта выдатны прыклад таго, што ў нас у краіне ёсць магчымасці, сілы і рэсурсы, каб арганізоўваць будаўнічы працэс на самым высокім узроўні. Для гэтага ўсяго толькі трэба своечасова і правільна прымаць неабходныя кіраўніцкія рашэнні.»

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 09.08.2013 г.

Долар ЗША	8890,00	▼
Еўра	11880,00	▲
Рас. руб.	270,00	■
Укр. грыўня	1095,57	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 34°
Віцебск	+ 31°
Гомель	+ 32°
Гродна	+ 32°
Магілёў	+ 29°
Мінск	+ 32°

■ Беларусы ў свеце

«ПТУШКАЙ БЫ ПАЛЯЦЕЛА НА РАДЗІМУ, АЛЕ...»

Карэспандэнтка «Звязды» наведала месца кампактнага пражывання беларусаў у Сібіры

Пасёлак Ташара практычна нічым не адрозніваецца ад беларускіх вёсак. Адзінае, што дроў каля хат пабольш. Бо, як сцвярджаюць мясцовыя жыхары, надвор'е не балуе іх цеплынёй. Зіма ў Сібіры больш суровая, чым у Беларусі. Таму рыхтуюцца да яе тамтэйшыя беларусы загадзя і рупліва...

Беларускі Сібіры ахвотна вудзяць рыбу.

СІБІРСКАЯ ІГРУШКА

Каля адной з дзевяці мясцовых крам я сустрэла маленькую бабульку з торбай.

— *Дзе тут знайсці беларусаў? — пытаюся.*

— Ды тут добрая палова вёскі беларусаў! — пачула ў адказ. — Вунь якраз дзве з іх ідуць, Трус ды Нікіфаронак.

— *Вы праўда родам з Беларусі? — перапытваю ў жанчын.*

— Анягож, — адразу ж ідзе на кантакт тая, што ў хусцінцы. — У Ташары шмат беларусаў. У свой час сюды пераехала амаль уся Ігрушка. СТАР 2

■ Падрабязнасці

НОВЫЯ ЗАРОБКІ — З НОВАЙ НАГРУЗКАЙ

Павышэнне заробкаў у педагогаў звязалі з павелічэннем нагрузкі

Павелічэнне з 1 верасня асобным катэгорыям педагагічных работнікаў тарыфнай стаўкі на 25%, прадугледжанае пастановай урада, закране больш як 100 тысяч настаўнікаў і педагагічных работнікаў, паведамілі журналісту «Звязды» ў Міністэрстве адукацыі.

Але павелічэнне заробкаў адбудзецца адначасова з павелічэннем нагрузкі на педагогаў.

— У мэтах павышэння эфектыўнасці выкарыстання працы настаўнікаў было прынята рашэнне павысіць з 1 верасня 2013 года настаўнікам і педагогам дадатковай адукацыі норму гадзін педагагічнай нагрузкі на стаўку з 18 да 20 гадзін у тыдзень. А выкладчыкам устаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі — з 720 да 800 гадзін у год, — удакладнілі ў міністэрстве.

Дакумент Міністэрства адукацыі, які рэгулюе павышэнне нагрузкі настаўнікам і іншым катэгорыям педагагічных работнікаў, напрамую звязаны з пастановай Савета Міністраў «Аб павышэнні заработнай платы асобным катэгорыям педагагічных работнікаў».

Гэтае павелічэнне будзе ажыццяўляцца за кошт сродкаў, што вызваляюцца ў выніку павелічэння педагагічнай нагрузкі на стаўку і эканоміі сродкаў ад аптымізацыі ўстаноў адукацыі і колькасці педагагічных работнікаў, а таксама іншых выдаткаў, прадугледжаных на адукацыю, і не патрабуе дадатковых бюджэтных сродкаў.

Пытанне павелічэння настаўнікам педагагічнай нагрузкі на стаўку было ўзгоднена Міністэрствам адукацыі з упраўленнямі адукацыі аблвыканкамаў і камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама, а таксама абмяркоўвалася з педагагічнай грамадскасцю. У галоўным адукацыйным ведамстве ўпэўнены, што высокія вынікі здольны паказаць толькі матываваны, у тым ліку і матэрыяльна, педагог. Але павышэнне заработнай платы, у сваю чаргу, таксама павінна быць матывавана. У гэтым выпадку павышэнне заработнай платы было ўзаемазвязана з павышэннем нормы педагагічнай нагрузкі на стаўку. Зроблены крок закліканы рэалізаваць на практыцы дзейсны механізм павышэння якасці адукацыі...

Надзея НІКАЛАЕВА.

СА СВЯТАМ НАС!

«Аж з сямнаццатага года
Шчасце ў доме ці бяда,
Ты прыходзіла к народу
Беларуская «Звязда»...

Гэтыя прыгожыя радкі напісаў наш шаноўны падпісчык спадар Лось з Глыбокага — гадоў з дзесяць таму. Не ў памяці ўжо — проста так ці да нейкай даты? Магчыма — да дня народзінаў?

Ён, гэты дзень, вядома ж, ёсць: першы нумар «Звязды» выйшаў 9 жніўня 1917 года. Таму сёння мы шчыра віншуем кожнага з былых і цяперашніх супрацоўнікаў газеты, кожнага з яе падпісчыкаў! Са святам нас! Здароўя, грошай і аптымізму! Як мінімум — да звяздоўскіх ста...

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАРЛАМЕНТ ЧЭХІІ ВЫНЕС ВОТУМ НЕДАВЕРУ ЎРАДУ

Новы ўрад прэм'ер-міністра Чэхіі Іржы Руснака не атрымаў вотум даверу ў Палаце дэпутатаў парламента Чэхіі — у бліжэйшы час прэм'ер-міністр і яго кабінет сыдуць у адстаўку, паведамляюць інфармагенцтвы. Супраць кабінета прагаласавалі 100 дэпутатаў, у яго падтрымку выказаліся 93 заканадаўцы. Для таго, каб заручыцца даверам, кабінету Руснака неабходна было набраць як мінімум 101 голас у сваю падтрымку.

АСАД ВЫСТУПІЎ ПАСЛЯ ПАВЕДАМЛЕННЯ АБ ЗАМАХУ

Паўстанцы з падраздзялення Свабоднай сірыйскай арміі заявілі ў чацвер, што абстралялі ракетамі картэж прэзідэнта Башара Асада, калі той накіроўваўся для малітвы ў мячэць Дамаска з нагоды мусульманскага свята Ураза-байрам, якое адзначаецца ў гонар заканчэння паста Рамадан, паведаміў міжарабскі тэлеканал Al Arabiya. Аднак дзяржаўнае тэлебачанне паказала, як кіраўнік дзяржавы, цэлы і здаровы, моліцца ў мячэці ў раёне Аль-Малькі, дзе знаходзіцца яго рэзідэнцыя, перадае агенцтва Reuters. У камандаванні сірыйскай арміі паведамленні аб абстрэле картэжу Башара Асада назвалі лжывымі, перадае ў чацвер агенцтва EFE.

МАГНІТНАЕ ПОЛЕ СОНЦА ХУТКА ПАМЯНЯЕ ПАЛЯРНАСЦЬ

Па інфармацыі амерыканскага касмічнага агенцтва NASA, у бліжэйшы час магнітнае поле Сонца перавернецца — гэтая падзея адбываецца з цыклічнасцю ў 11 гадоў і звязана з дасягненнем сяцілам піку актыўнасці. Назіранні сонечнай абсерваторыі NASA паказваюць, што гэты момант вельмі блізкі, перадае Space.com. «Падобна на тое, нам засталося не больш за тры-чатыры месяцы да поўнага развароту поля. Гэтае змяненне выкліча хвалевы эфект па ўсёй Сонечнай сістэме», — заявіў дырэктар абсерваторыі Сонца Тод Хоксема са Стэнфардскага ўніверсітэта. Не выключана, што гэты працэс акажа ўплыў і на Зямлю — прывядзе да негатыўных перамен у клімаце, праблем са спадарожнікамі GPS і ўсплёску напружання ў лініях электраперадач, піша брытанская газета The Daily Mail.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

АДНОСІНЫ РАСІІ І ЗША «ЗАМАРОЗІЛІ» ДА 2017 ГОДА

Барак Абама яшчэ ў панядзелак прыняў рашэнне адмяніць маскоўскія перамовы з Уладзімірам Пуціным, у аўторак яно было канчаткова ўзгоднена ў Белым доме, і толькі ў сераду Дзярждэпартамент праінфармаваў пра гэта Расію, распавёў газеце The Wall Street Journal высокапастаўлены прадстаўнік амерыканскай адміністрацыі.

Больш за тое, у прэзідэнта ЗША няма планаў сустракацца з расійскім лідарам і на палях вераснёўскага саміту «вялікай дваццаткі» ў Санкт-Пецярбургу, ад удзелу ў якім ён не адмовіўся. У Белым доме не выключаюць цалкам, што сустрэча можа адбыцца, аднак у лік афіцыйна запланаваных мерапрыемстваў яна не ўваходзіць. Эксперты, як у ЗША, так і ў Расіі, гавораць ужо не проста аб новым ахаладжэнні адносін паміж дзвюма краінамі, але і пра змену арыенціраў у знешняй палітыцы Вашынгтона, піша «Коммерсантъ». На іх думку, Расію выключаюць са спіса прыярытэтаў як мінімум да канца другога тэрміну Абамы. Гісторыя са Сноўдэнам стала толькі кульмінацыяй працэсу, які абазначыўся год таму.

КАРОТКА

У Беларусі ўніфікаваны мінімальныя патрабаванні да АЗС на магістральных рэспубліканскіх дарогах «М» і «М / Е». Зараз усе АЗС, якія будуюцца і рэканструююцца на магістралях, павінны быць забяспечаны стацыянарным гандлёвым аб'ектам, гандлёвым аб'ектам грамадскага харчавання, аўтастаянкай не менш чым на два аўтобусы, пяць грузавых і пяць легкавых аўтамабіляў.

Прэзентацыя беларускага турбізнесу ўпершыню адбудзецца на міжнароднай выстаўцы IFTM Top Resa ў Парыжы 24-27 верасня. У рабоце выстаўкі прымуць удзел прадстаўнікі турыстычных комплексаў, у прыватнасці Мірскага і Нясвіжскага замкаў, інфармацыйна-турыстычны цэнтр «Мінск», арганізацыі Віцебскай вобласці.

У чарговым рэйтынгу нацыянальных зборных, які ўчора апублікавала ФІФА, каманда Беларусі паднялася на 5 радкоў і займае цяпер 73-е месца.

Электронная бібліятэка БДУ ўвайшла ў сотню лепшых бібліятэк свету.

У Крыме сутыкнуліся чатыры аўтамабілі, пацярпелі нашы суграмадзяне — дзве жыхаркі Брэста, а таксама 11 расіян і 3 украінцы.

Дырэктар прыватнага гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства ў Гродне падазраецца ва ўхіленні ад выплаты сум падаткаў (здзяйсненні шэрагу прытворных здзелак, штучна завышаючы панесеныя прадпрыемствам выдаткі на арэндныя плацяжы і кансультацыйныя паслугі), што пацягнула прычыненне шкоды ў асабліва буйным памеры — больш за Br420 млн.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ ПРЭЗІДЭНТУ АРГЕНЦІНЫ Ў СУВЯЗІ З АХВЯРАМІ ВЫБУХУ Ў ЖЫЛЫМ БУДЫНКУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Аргенцінскай Рэспублікі Крысціне Элізабет Фернандэс дэ Кіршнер, родным і блізкім загінулых у выніку выбуху ў жылым будынку ў горадзе Расарыа. Кіраўнік дзяржавы таксама перадаў пажаданні хутчэйшага выздараўлення ўсім пацярпелым у выніку гэтай трагедыі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«РАІЦЦА З ЛЮДЗЬМІ!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Айчынныя карпарацыі будаўнічых матэрыялаў хутка аб'яднаюцца ў цэментны холдынг. Акрамя чатырох цэментных заводаў, далучацца і прадпрыемствы па вытворчасці жалезабетонных канструкцый. Гэта магчыма дзякуючы рабоце «Белгіпса», які па-ранейшаму паспяхова выконвае праграму цэментнай прамысловасці. З 10,5 мільёна тон прадукцыі амаль палова застаецца ў Беларусі, астатняе ж ідзе на экспарт. Такім чынам, цалкам задаволеныя патрэбы дазваляюць канстатаваць пераадоленне колішняга дэфіцыту ў цэменце. Таму сёння з'яўляецца новая мэта — знайсці рынкі збыту за мяжой. Сёлета міністэрства запланавала збыць больш за паўтара мільёна тон беларускага цэменту ў Расіі, прычым палова ўжо рэалізавана.

Найбольшы прырытэт аддаецца будаўніцтву содавага завода на Гомельшчыне. Праект распрацоўваецца сумесна з кітайскімі, расійскімі і ўкраінскімі партнёрамі. Беларусь адказвае за фінансаванне інфраструктуры для прадпрыемства. Перамовы наконт праекта на стадыі завяршэння. Зараз удакладняюцца асобныя тэхналогіі. Завод абяцае быць цалкам бяспечным для навакольнага асяродзя. Адходы пойдуць на перапрацоўку, будуць усталяваныя дадатковыя фільтры. Таксама ў планах жорсткія экалагічныя экспертызы.

Павялічваецца знешні прамысловы інтарэс: у Венесуэле завершана работа над чацвёртым беларускім заводам. Цяпер айчынныя дарогі пракладваюць на іншым кантыненце.

Маргарыта СІДАР.

■ Эканоміка

ДЗЯРЖБЮДЖЭТ БУДЗЕ СКАРЭКТАВАНЫ

Недапаступленні ў рэспубліканскі бюджэт будуць кампенсавацца за кошт другасных патрэб

Пра гэта на прэс-канферэнцыі па выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны за I паўгоддзе 2013 года журналістам паведаміў намеснік міністра фінансаў РБ Максім ЕРМАЛОВІЧ. Па яго словах, зараз каля 13 трыльёнаў рублёў у дзяржаўным бюджэце не падмацавана прыбыткамі. Для таго, каб сёлета не дапусціць дэфіцыту бюджэту, Мінфін прыме шэраг мер. Сярод іх — скарачэнне непершачарговых выдаткаў, выманне часткі прыбытку дзяржаўных прадпрыемстваў, увядзенне ў зварот вытворчых пляцовак, якія выкарыстоўваюцца неэфектыўна.

У сваю чаргу, намеснік міністра эканомікі Беларусі Аляксандр ЯРАШЭНКА ахарактарызаваў сённяшнюю сітуацыю ў эканоміцы як «няпростую», але пры гэтым зазначыў, што хапае як пазітыўных момантаў, так і праблемных. Па яго словах, айчынная эканоміка прайшла «кропку перагібу»: апошнім часам тэмпы росту ВУП Беларусі няўхільна зніжаліся і за першыя 5 месяцаў гэтага года склалі ўсяго 1,1%. Зараз жа зноў назіраецца рост: за I паўгоддзе ён дасягнуў 1,4%. Апераджальнымі тэмпамі, калі параўноўваць з прагнозамі, расце і прадукцыйнасць працы: за 5 месяцаў — на 2,6%.

Што датычыцца інвестыцый, то паказчык уласнага інвеставання таксама знізіўся. Зараз ён знаходзіцца на ўзроўні 108,8% ад узроўню аналагічнага леташняга перыяду. Аднак выключна пазітыўна такую лічбу ацаніць нельга, з-за істотнага зніжэння ўзроўню інвеставання летась. А вось колькасць замежных інвестыцый у беларускую эканоміку ўзрасла ажно ў 2,5 раза і дасягнула 1 543,3 мільёна долараў. Аляксандр Ярашэнка спадзяецца, што да канца года сума замежных інвестыцый перавысіць лічбу ў 2 мільярды долараў, у першую чаргу — за кошт супольных з іншымі краінамі прадпрыемстваў у сферы дрэваапрацоўкі і машынабудаўніцтва.

Экспарт беларускіх тавараў за мяжу знізіўся да 79,1% у параўнанні з перыядам студзеня—мая 2012 года, імпарт — да 89,1%. Па параметрах эканамічнай бяспекі Беларусь застаецца на стабільным узроўні: сумарная знешняя дзяржпазыка складае 12,4 мільярда долараў, або 18% ВУП. Парог бяспекі звычайна ацэньваецца як 25% ВУП. Унутраная дзяржпазыка захоўваецца на ўзроўні, далёкім ад парогу бяспекі.

Максім Ермаловіч таксама падкрэсліў, што мадэрнізацыя дзяржпрадпрыемстваў не фінансуецца з рэспубліканскага бюджэту, а праводзіцца за ўласныя сродкі прадпрыемстваў. Па яго словах, недапушчэнне дэфіцыту бюджэту і барацьба з інфляцыяй зараз з'яўляюцца прыярытэтнымі накірункамі эканамічнай палітыкі Беларусі.

Таксама намеснік міністра распавёў пра алгарытм атрымання сродкаў, які можа быць выкарыстаны ў дачыненні да вытворчых пляцовак, якія выкарыстоўваюцца неэфектыўна (адпаведныя змены плануецца ўнесці ў Падатковы кодэкс). Ён паведаміў, што зараз у краіне вельмі шмат памяшканняў, якія прастойваюць або, у лепшым выпадку, здаюцца ў арэнду. Хутчэй за ўсё, падатак на такія плошчы будзе павышаны, а ўладальнікам будзе прапанавана збыць плошчы пастаянным арандатарам па рынкавым кошце. У выніку адмовы арандатара ад набыцця памяшканні будуць выстаўляцца на аўкцыён. Эфект такіх мерапрыемстваў па словах спадара Ермаловіча, не фіскальны, а эканамічны, бо гэта створыць матэрыяльна-тэхнічную базу для развіцця малога і сярэдняга бізнесу.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

■

«ПТУШКАЙ БЫ ПАЛЯЦЕЛА НА РАДЗІМУ, АЛЕ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— А што за Ігрушка? У нас у Беларусі ёсць вёска з такой назвай. У Крупскім раёне. Існуе паданне, што яе заснавалі тры браты побач з грушай.

— Праўда? — цікавіцца другая кабета. — Дык вы ажно з Беларусі да нас?.. А нашай Ігрушкі даўно ўжо няма (*уздыхае*)...

Да нашай размовы пакрысе далучыліся іншыя ташарынцы, якія якраз у гэты час праходзілі міма. І наперабой пачалі распавядаць пра тое, як на сібірскай зямлі ўзнікла Ігрушка.

«310 гадоў таму тут непадалёк казацкі атрад пад правадырствам ліцвіна Круглікава ўзвёў Умрэвінскі астрог. У адзін цудоўны дзень побач з умацаваннем з'явіліся беларусы...»

«Хадакі так званыя, бо пешшу дабіраліся да Сібіры. Вабілі нашых прадзедаў сюды сібірскія прасторы. Бо ў Беларусі было мала зямель для вялікага ўраджаю, практычна адны балоты...»

«Казакі вырашылі праверыць новых суседзяў на трываласць: паставілі ім нейкаверныя ўмовы. Маўляў, вы тут паселіцеся, калі пабудуеце за ноч дом і раніцай сустрэнеце гаспадароў гэтай зямлі гарачым хлебам. Якім жа было іх здзіўленне, калі на світанку яны адчулі пах хлеба... Выйшлі і не паверылі сваім вачам...»

Раней жа якія маразы былі жудасныя! Больш за 50 градусаў. Плюнеш — дык сліна замярзае.

— Той першы дом Аўхімовіч пабудаваў, Кацін прадзед, — паказвае хударлявы мужчына ў акулярах на Кацярыну Іванаўну Аўхімовіч. — Днём беларусы нарыхтоўвалі і апрацоўвалі драўніну, ноччу складвалі дом за домам... Неўзабаве на тым месцы вырасла ладная вёсачка. І назвалі яе Ігрушкай.

«ЦЭЛЫ ГОД АДКЛАДВАЮ ГРОШЫ, КАБ УВЕСНУ ПАЕХАЦЬ У БЕЛАРУСЬ»

Шмат беларусаў паўцякала ў Сібір падчас Сталыпінскай аграрнай рэформы. Не сталі выключэннем і продкі 73-гадовага Івана Міхайлавіча Сямёнава.

— Цэлымі вёскамі людзі здымаліся і разам з маленькімі дзецьмі перасяляліся ў тайгу: туды, дзе зямлі столькі, што бяры — не хачу. А цяпер нікому тая зямля не патрэбна, — уздыхае спадар Сямёнаў. — Калгасы паразганялі. Палі ў запусценні стаяць...

У дварэ спадара Сямёнава стаіць трактар «Беларус».

Цэлымі вёскамі людзі здымаліся і перасяляліся ў тайгу: туды, дзе зямлі столькі, што бяры — не хачу. А цяпер нікому тая зямля не патрэбна...

— Раней кароў набіралася з дзвюх вуліц каля сарака штук, — працягвае распавядаць пра набалелае Іван Міхайлавіч. — А цяпер у нас на Юбілейнай толькі чатыры гаспадары трымаюць рагуль. Людзі співаюцца. Дзіву даюся: дзе яны толькі грошы бяруць? Смехам кажу, што прыйшоў час антыалкагольнай рэвалюцыі.

Праўда, не ўсіх этнічных беларусаў Сібір прывабіла зямлёй. Прынамсі, Ніну Яфрэмаўну Нікіфаронак 43 гады таму прывяло сюды каханне.

— Пяць гадоў прайшло, як мужа пахавала... — уздыхае Ніна Яфрэмаўна. — Безумоўна, сумую па радзіме. Таму цэлы год адкладваю з пенсіі грошы, каб увесну паехаць у Чэрвень, Беразіно. Там у мяне радні шмат. Браты, сёстры стрыечныя. Яны ж усе па-беларуску гавораць. А ў мяне ніяк не супадае з імі. Адвыкла за паўвека. «Ну, кажуць, наша сястрыца абрусела там у Сібіры». Па першасці ж, калі скажу «бульба» ці «цыбуля», дык на мяне карэнныя сібіракі дзіўна глядзелі, не разумелі. ...Вярнулася сюды і зноўку пачынаю сумаваць па радзіме. Плачу... Птушкай бы паляцела туды, але... Унукі тут, праўнукі. Як разарвацца?.. Таму чакаю наступнага года. Ужо пачала збіраць грошы на білеты...

— А я ў Беларусі ні разу і не была, — уздыхае Валянціна Мікалаеўна Трус. — Усё збіралася з'ездзіць, калі яшчэ цёця Надзя была жывая, маміна стрыечная сястра. Але так і не з'ездзіла. А цяпер ужо куды я паеду... Гады такія!...

«ДЛЯ МЯНЕ БЕЛАРУСКАЯ МОВА НЕ ЧУЖАЯ»

— А давайце мы вам пакажам тыя прасторы, што шмат гадоў таму вабілі нашых продкаў у Сібір? — прапаноўвае спадар Сямёнаў і ветліва адчыняе мне дзверы сваёй «Лады».

Праз хвілін пяць мы ўжо былі на ўскрайку Ташары, дзе раскінулася бяскрайняя Об.

— Раней рака разлівалася і заліваа агароды, — кажа спадарыня Трус. — Людзі, якія жылі тут непадалёку ад берага, расказвалі, што, каб выратавацца ад вады, даводзілася залазіць на печку. Дзякуй Богу, што пабудавалі ГЭС...

— Хлопцы, як клёў? — цікавіцца ў маленькіх рыбакоў Ніна Нікіфаронак, якая, як высветлілася, у мінулым заўзятая рыбачка.

— Сібір багатая не толькі на рыбу, але і на кедравыя арэшкі, — распавядае жанчына. — Мы з дзедам, калі ён яшчэ быў жывы, ездзілі шышкарыць. У тайзе кедравых месцаў шмат.

— І для паляўнічага сібірская тайга рай, — падхоплівае Іван Сямёнаў. — Я, калі быў маладзейшым, аматар быў папаляваць. Тайгу ўсю ведаў як свае пяць пальцаў. Па сонцы арыентаваўся. Ды компас у мяне на гадзінніку быў, маленькі, як пазногаць.

— Складана, пэўна, тут у Сібіры жыць? Трэба моцная загартоўка?..

— Дровы ёсць — пражывеш, — усміхаецца Валянціна Мікалаеўна. — Ды і што ўтойваць: тут у нас у апошнія гады стала нашмат цяплей. Раней жа якія маразы былі жудасныя! Больш за 50 градусаў. Плюнеш — дык сліна замярзае.

— Раней беларусы ў Сібіры жылі талакой. Калі нехта захварэў ці застаўся без кармільца — дапамагала ўся абшчына. Дзякуючы гэтаму і выжылі. А цяпер ці дружна жывуць у Ташары этнічныя беларусы?

— Дружна. А чаму ж не? — адказваюць у адзін голас.

— Памаленьку жывём, — працягвае спадарыня Трус. — З песнямі!

— З беларускімі, спадзяюся?

— А як жа ж? — усміхаецца Алена Рыбакова. — У тым ліку і з беларускімі. У нас жа ў Ташары ёсць вакальная група «Радава». Я яе ўзначальваю. Паколькі мой бацька этнічны беларус, мама, колькі сябе памятаю, выпісвала «Работніцу і сялянку». Таму для мяне беларуская мова не чужая. Беларускія песні — у прыватнасці, песняроўскі рэпертуар — заўсёды гучалі падчас застолля, калі мы збіраліся раднёй.

«БЕЛАРУС» БЕЛАРУСУ Ў ПАДМОГУ

Іван Міхайлавіч, як сапраўдны джэнтльмен, развёз аднавяскоўак па дамах. На развітанне адна з жанчын задала пытанні, якімі, прызнаюся, вельмі расчуліла. «Дачушка, а бульбачка ў Беларусі ці ўрадзіла? Жукі каларадскія ці ёсць?»

— Мы ж хоць і ў Сібіры жывём, але бульбу любім, — падхоплівае Ніна Нікіфаронак. — І дранікі пячом. Прынамсі для мяне гэта самая добрая ежа. Разаб'ю пару яек на патэльні, палью яечню смятанай і мачу туды блінцы.

— А якія ж смачныя камы з бульбы, ягады ў малацэ! — працягвае спадарыня Трус. — Мо затрымайцеся ў нас на колькі дзён. Пачастуем. Спыніцца ж ёсць дзе: я ж адна жыву, і Ніна — адна.

Калі мы пад'ехалі да хаты Івана Сямёнава, то мне адразу ж у вочы кінуўся сіні трактар з надпісам «Беларус».

— Яму ўжо 37 гадоў, — усміхаецца гаспадар. — За гэты час ні разу мяне не падвёў. Я ж усё жыццё трактарыстам прапрацаваў у калгасе. Падчас уборкі добра зарабляў. Таму і пенсія цяпер ледзь не ў два разы большая, чым у ташарынскіх пенсіянераў, — 11 тысяч рублёў. Праўда, вы не падумайце, я не шыкую. На лекі трэба грошы. Жонка нядаўна інсульт перажыла. Вось «Ладу» гэтую ў крэдыт узяў, дык выплачваю.

«Ну, кажуць, наша сястрыца абрусела там у Сібіры». Па першасці ж, калі скажу «бульба» ці «цыбуля», дык на мяне карэнныя сібіракі дзіўна глядзелі, не разумелі.

...Дзякуй, дачушка, што нас, старых, праведала. Менавіта ў нашу вёску завіталa. Бо ў Сібіры ёсць і іншыя вёскі — Зверабойка, Каўбаса, дзе шмат беларусаў жыве. Вязі прывітанне Гомельшчыне, — вочы сціплага дзядулі ледзь прыкметна павільгатнелі. — Кажамякам, Цімашэнкам, Ялагам, Радчанкам — маёй радні там вельмі шмат...

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.

Мінск—Новасібірская вобласць.

Без дроў у сібірскай вёсцы не пражывеш.

■ Надвор'е

УСЛЕД ЗА СПЯКОТАЙ — МОЦНЫЯ ЛІЎНІ І НАВАТ ГРАД

Сёння ў Брэсцкай вобласці сіноптыкі папярэджваюць аб чырвоным (максімальным) узроўні небяспекі па тэмпературы +35.

У пятніцу тэрыторыя нашай краіны застанецца пад уплывам гарачага паветра, якое паступае да нас з боку поўдня Еўропы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Пры павышаным фоне атмасфернага ціску ападкаў не будзе. Максімальная тэмпература паветра ўдзень плюс 30—34 градусы, а па паўднёвым захадзе краіны — да 35 цяпла.

Ужо ў суботу надвор'е сапсуецца. З боку Заходняй Еўропы да нас завітае моцны атмасферны фронт. Таму ўначы на паўночным захадзе, а ўдзень і ў цэнтральных раёнах краіны пройдуць навальнічныя дажджы. Удзень, месцамі пры навальніцах, чакаецца шквалістае ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. У асобных раёнах прагназуюцца нават моцныя ліўні і град. Тэмпература паветра ўначы на суботу 17—22 цяпла, а ўдзень тэмпературны фон будзе вагацца ад плюс 21 градуса па захадзе краіны да 34 цяпла па паўднёвым усходзе Беларусі.

І ў нядзелю амаль паўсюдна будуць ісці кароткачасовыя дажджы, месцамі — навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах дажджы моцныя. Удзень на ўсходзе краіны пры навальніцах прагназуецца шквалістае ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература ўначы на нядзелю 15—22 цяпла, удзень — плюс 22—28 градусаў, а па паўднёвым усходзе — да 29—33 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у пачатку наступнага тыдня (панядзелак—аўторак) тэрыторыя Беларусі трапіць у зону паніжанага атмасфернага ціску. Таму месцамі будуць ісці непрацяглыя дажджы, часам навальніцы. Тэмпература паветра ўначы плюс 12—18 градусаў, а ўдзень — ад 24 да 29 цяпла. Далей сіноптыкі прагназуюць, што ў сераду дзённая тэмпература знізіцца да 17—23 градусаў, а вось у Брэсцкай і Гомельскай абласцях будзе плюс 25 градусаў. Месцамі чакаецца кароткачасовы дождж.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Гучная справа

ЗАТРЫМАЛІ ПАДАЗРАВАНАГА Ў ЗАБОЙСТВЕ ЧЛЕНА ЦВК БЕЛАРУСІ

«4 жніўня 2013 года трагічна загінула член Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Святлана Хіневіч», — такое паведамленне з'явілася ўчора на сайце Цэнтральнай камісіі.

Як паведамілі ва ўпраўленні Следчага камітэта па горадзе Мінску, труп жанчыны са шматлікімі колата-рэзанымі ранамі знайшлі некалькі дзён таму ў яе дома. «На гэты момант па крымінальнай справе ўстаноўлены падазраваны. Здзейсненае злачынства мае бытавы характар і ніяк не звязана з прафесійнай і грамадскай дзейнасцю пацярпелай. Па справе прызначана прыкладна 20 розных экспертыз».

Святлана Хіневіч працавала начальнікам аддзела кадраў адкрытага акцыянернага таварыства «Крышталь» і адначасова з 2011 года з'яўлялася членам Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў. Нарадзілася жанчына ў 1959 годзе ў Мінску. Па адукацыі — юрыст.

Надзея ДРЫЛА

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ЛІКБЕЗ АБ ЭЛЕКТРОННЫМ ЗБОРЫ НА ДАРОГАХ

У Цэнтры дзелавой адукацыі Беларускай гандлёва-прамысловай палаты 16 жніўня будзе арганізаваны семінар-кансультацыя «Сістэмы электроннага збору платы за праезд па аўтамабільных дарогах Рэспублікі Беларусь», паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Мінтранса.

На семінары выступяць і адкажуць на пытанні ўдзельнікаў: Яўген Вячаслававіч Ракала, начальнік Галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь; Аляксандр Іосіфавіч Сідаровіч, начальнік юрыдычнага аддзела ЗТАА «Капш Тэлематык Сервісіз» і Максім Анатольевіч Кавалёнак, эксперт юрыдычнага аддзела ЗТАА «Капш Тэлематык Сервісіз».

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэлефонах: (8 017) 290-72-59, 290-72-77, (8 029) 118-08-70.

Сяргей ПАЛІНІН.

ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ КРЫХУ СКАРАЦІЛІСЯ

Па выніках ліпеня золатавалютныя рэзервы Рэспублікі Беларусь у вызначэнні ССРД МВФ скараціліся на 101,3 млн долараў і, паводле папярэдніх даных, на 1 жніўня сёлета склалі 7 916,3 млн долараў у эквіваленце, паведамілі рэдакцыі ў прэс-цэнтры Нацыянальнага банка Беларусі.

У нацыянальным вызначэнні аб'ём золатавалютных рэзерваў скараціўся на 77,8 млн долараў і на 1 жніўня сёлета склаў 8 554,8 млн долараў у эквіваленце.

Спецыялісты фінансавай сферы адзначаюць, што на зніжэнне аб'ёму золатавалютных рэзерваў аказала ўплыў пагашэнне ўрадам і Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце ў поўным аб'ёме.

Падтрыманню аб'ёму золатавалютных рэзерваў у ліпені гэтага года ў асноўным спрыяў рост цаны на золата на міжнародным рынку каштоўных металаў.

Сяргей КУРКАЧ.

«ПАВЕТРАНЫ» ДЭБАШЫР ЗАТРЫМАНЫ

Самалёт «Белавія», які з-за п'янага пасажыра вымушаны быў вярнуцца ў Маскву, у другі раз вылецеў у Мінск.

У беларускай авіякампаніі паведамілі, што самалёт рэйсам B2-984 вылецеў з Масквы ў Мінск учора ў 10.18 па маскоўскім часе. І ўжо праз 27 хвілін вярнуўся ў аэрапорт вылету. Палёт быў перапынены з-за пасажыра, які знаходзіўся нападпітку і ўчыніў дэбош на борце пасля ўзлёту. Экіпаж і пасажыры агульнымі намаганнямі спынілі хуліганскія дзеянні мужчыны: пасадзілі яго ў крэсла і звязалі. Пасля пасадкі дэбашыра, які аказаўся 32-гадовым ураджэнцам Казані, перадалі ў рукі расійскай паліцыі. Рашэнне вярнуць самалёт у аэрапорт вылету прымаў камандзір экіпажа паветранага судна. Пры гэтым аб нестандартнай сітуацыі на борце ён паспеў апавясціць наземныя службы аэрапорта Дамадзедава. У 11.40 па маскоўскім часе самалёт зноў вылецеў у Мінск. Нацыянальная авіякампанія «Белавія « дзякуе пасажырам за дапамогу і прыносіць прабачэнне за нязручнасці.

Надзея ДРЫЛА.

У БАЛІВУДЗЕ ЗНЯЛІ РЫМЕЙК САВЕЦКАЙ «ІРОНІІ ЛЁСУ»

У індыйскім Балівудзе знялі свой варыянт вядомай савецкай камедыі «Іронія лёсу, або З лёгкай парай», перадаюць інфармагенцтвы.

Фільм «Я люблю Новы год», сюжэт якога вельмі нагадвае вядомы фільм Эльдара Разанава, павінен выйсці на вялікія экраны 13 верасня. Падзеі індыйскай кінастужкі адбываюцца ў Нью-Ёрку. Замест урача Жэні Лукашына галоўным героем фільма стаў мумбайскі банкір-дзівак. Як і персанаж савецкай карціны, галоўны герой разам з сябрам пад Новы год адпраўляецца ў лазню, распівае алкаголь і выпадкова разам сябры ляцяць у Нью-Ёрк. Там ён трапляе ў кватэру да маладой дзяўчыны, якая збіралася сустрэць свята з жаніхом. Індыйскі фільм практычна цалкам капіруе сюжэт карціны Эльдара Разанава, аднак у балівудскім варыянце прысутнічаюць песні і танцы, якімі знакаміта кіно Індыі.

У цітрах ні прозвішча рэжысёра расійскай версіі Эльдара Разанава, ні прозвішча сцэнарыста Эміля Брагінскага не фігуруюць. Рэжысёр індыйскай кінастужкі заявіў, што ён нібы нічога не чуў аб існаванні савецкага фільма.

НАСТОЯЩИЙ ВНЕДОРОЖНИК UAZ PATRIOT В КРЕДИТ ОТ 2,3 МЛН РУБЛЕЙ В МЕСЯЦ

Ему нет равных.
Сказывается превосходство российских военных технологий и крайне удачное конструкторское решение современного комфортного кузова. По данным Белорусской автомобильной ассоциации, среди больших внедорожников UAZ Patriot лидирует по продажам по итогам прошлого года с очень солидным отрывом. Оно и не мудрено.

За цену легкового седана UAZ предложил настоящий рамный полноприводный внедорожник с **бензиновым (2,7 л) либо дизельным (2,3)** двигателем. Для езды по серьезному бездорожью используется механизм включения пониженной передачи через раздаточную коробку. Как правило, этого хватает, чтобы дорогу просто не замечать. Ну а для настоящих эстетов внедорожного экстрима дилер UAZ дополнительно ставит механизм блокировки дифференциала.

Кто ездил на больших автомобилях, тот знает их преимущества: комфорт, устойчивость, пассажировместимость (в «Патриоте» – **до 9 человек**!), возможность перевезти холодильник на дачу и весь урожай обратно.

Да что там урожай! Объем внутреннего пространства автомобиля для перевозки груза при сложенных сидениях достигает **2,8 куб. метра**!

Тяговитый дизель на шоссе легко разгоняет автомобиль до разрешенного предела скорости. Сказывается высокий крутящий момент – до **270 н\м уже при 1800 об\мин**. Он, кстати, с легкостью и вытянет Вас с любого бездорожья. Благо, минимальный **дорожный просвет у автомобиля 210 мм.**

Машина серьёзная. Для серьёзных мужчин. Не ждите от нее городского комфорта кроссоверов с автоматической коробкой передач и прочей атрибутикой, не имеющей ничего общего с конструкцией настоящих внедорожных машин. Здесь, как говорится, «девочки налево, мальчики направо».

И оставьте предрассудки: платите только за автомобиль, его ездовые свойства, комфорт, способность служить Вам долго и преданно. И недорого. По большому счету, какая разница, что приклеено на капоте.

Рамная конструкция кузова обеспечит долговечность эксплуатации автомобиля даже при больших нагрузках при езде по бездорожью, а также является важнейшим фактором безопасности.

Низкая цена UAZ Patriot – результат оптимального конструкторского решения, больших объемов производства и отсутствия таможенной пошлины на автомобили производства ОАО «УАЗ». У официального дистрибьютора автомобиль можно приобрести по **цене от 165 млн рублей.**

При сроках **гарантии 3 года или 100 000 км** стоимость технического обслуживания и автозапчастей вполне доступная.

Внедорожник Patriot оснащен полным электропакетом, подогревом сидений, кондиционером, литыми дисками и массой прочих нужных в современном автомобиле вещей.

В Беларуси заводом-изготовителем создано 19 фирменных сервисных центров, а количество СТО, сертифицированных для ремонта УАЗ, превышает 350 предприятий!

При покупке автомобиля в кредит суммы ежемесячного платежа составляют от **2 300 000 рублей в месяц.**

Для организаций автомобиль может быть предложен в **лизинг от 0%** годовых. Ноль и есть ноль. Никакого подвоха: целый год выплачиваешь стандартную стоимость автомобиля.

Дополнительную информацию Вы можете получить на сайте **www.uaz.by,** в отделе продаж официального дистрибьютора ОАО «УАЗ» в Республике Беларусь ЗАО «Внедорожник» по телефонам в Минске **(8-017) 295 65 71, 295 65 72** или **Velcom (8-044) 595 65 72.**

УНП 190545785

Утерянный представительством Белгосстраха по Советскому району г. Минска бланк страхового полиса по обязательному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0755307 **считать недействительным.** УНП 101883943

■ Медыяперсона

Вольга ВЕНСКАЯ:

«НА ТЭЛЕБАЧАННІ ТОЛЬКІ ФАНАТЫ СВАЁЙ СПРАВЫ ЗАСТАЮЦЦА Ў «АБОЙМЕ»

Яе поспех — вынік прыроднай настойлівасці і самаўдасканалення, якім спрыяе ўдача. У эфіры «Піжама-паці» на «Радыус-FM» яна спадарожнік і суразмоўца тых, каму не спіцца ноччу. На «НТБ-Беларусь» агучвае прагнозы надвор'я, а на «Беларусь 1» — абвяшчае шчаслівыя моманты выйгрышу ў праграме «Ваша лато». У свой час прыход на гэты праект быў, можна сказаць, экзаменам на прафесійную прыдатнасць, які Вольга Венская вытрымала на «выдатна». Мы сустрэліся з гэтай таленавітай дзяўчынай якраз пасля чарговага суботняга эфіру, і яна расказала, як распазнаць «тэлевізійны лёс», стварыць настрой без настрою і застацца ў абойме прафесіяналаў.

— Якія адчуванні застаюцца пасля эфіру «Ваша лато»?

— Калі працуеш на павышаным узроўні энергетыкі, то потым у пэўнай ступені адчуваеш спусташэнне. Разам з тым, мяне перапаўняе нейкая радасць, бо тая энергія, якая ідзе ад пераможцаў, часткова перадаецца і табе. Разумееш, што прыняла ўдзел у нечым важным за гэтую гадзіну, бо нехта стаў больш шчаслівым. І мне прыемна мець да гэтага дачыненне. Мяне часта пытаюць, ці не стамілася я яшчэ ад ролі дзяўчыны, якая кажа «Стоп гульня!»? Радасць ад гэтага падобная да той, калі ўрач паведамляе людзям, што яны стануць бацькамі. Тым больш што я прымаю ўдзел у стварэнні праграмы на розных этапах. Эфір — ужо вынік працы нашай творчай групы і кіраўніцтва «Беларускіх латарэй». А на працягу тыдня мы сустракаемся, абмяркоўваем розныя пытанні, шукаем гасцей, пішам сцэнарый, праца фактычна кіпіць кожны дзень. Праектам я жыву ўжо дванаццаць гадоў і, хачу спадзявацца, што супрацоўніцтва будзе працягвацца.

— «Ваша лато» — праграма пэўнага фармату. Ці не ўзнікала думак паспрабаваць сябе ў іншых праектах?

— Былі не толькі думкі, але і спробы. Разы два ўдзельнічала ў кастынгу на праграму «Добрай раніцы, Беларусь!» Атрымлівала добрыя водгукі ад рэжысёра, які прысутнічаў на рэпетыцыі. Аднак на тым усё і скончылася. Не ведаю, можа, проста яшчэ час не настаў. Унутры сябе я адчуваю, што магу зрабіць многае, і не перажываю. Наогул, навучылася цаніць тое, што маю зараз. У любым выпадку я рухаюся наперад і набываю вопыт.

— Прыход на «Ваша лато» адбыўся пасля вашага знаёмства з Сяргеем Кухто. Чаму вы навучыліся, працуючы побач з ім?

— Мы з Кухто пазнаёміліся яшчэ задоўга да адкрыцця праекта. У свой час я працавала ў праграме «5Х5». І аднойчы мы разам з маім аднакурснікам пайшлі на інтэрв'ю да Аксаны і Анатоля Вечар. Відаць, так замучылі іх пытаннямі, што тыя прапанавалі нам знайсці яшчэ кандыдатаў. Выпадкова тады сустрэлі Сяргея, паразмаўлялі з ім. Нейкі час зусім не перасякаліся. А калі прыйшла працаваць рэдактарам на праграму «Добры дзень, Беларусь!», то ён быў там вядучым. Потым, калі «Беларускія латарэі» адкрывалі праграму «Ваша лато», і быў аб'яўлены кастынг на ролю сувядучай, Кухто прапанаваў маю кандыдатуру. Мне падарылі шанц, вынік залежаў толькі ад мяне. Экзамен я вытрымала. Здаю яго паспяхова вось ужо не адзін год. На праграме Сяргей быў не толькі вядучым, але і кіраўніком. Таму ад яго я спасцігла сапраўдныя азы журналістыкі, здымачнага працэсу, арганізацыі прамога эфіру. Ён мог быць вельмі абаяльным на экране, а ў працы праяўляў патрабавальнасць. Школа, якую я прайшла ў Кухто, дапамагае мне і сёння.

Калі ёсць уяўленне пра тое, што хочаш сказаць і на чым зрабіць акцэнт, то ўжо не саб'ешся, нават зрабіўшы адступленне. Вялікі талент — умець думаць, імправізаваць і рэагаваць на сітуацыю хутка.

— Як мне вядома, вы таксама дзеліцеся прафесійным вопытам, займаючыся выкладчыцкай дзейнасцю...

— Неяк раз мяне запрасілі правесці невялікі майстар-клас у адну з кампаній, якая рыхтуе вядучых для радыё і тэлебачання. Потым зноў прапанавалі, прычым ацэнкі маёй працы былі станоўчымі. З часам майстар-класы перараслі ў заняткі. Для мяне такая дзейнасць — абсалютна новы кірунак, але мне ён падабаецца. Відаць, нагадваюць пра сябе выкладчыцкія гены бацькоў. Я прайшла праз мноства кастынгаў, вучылася на розных курсах, ведаю, якая праца вядучага ў рэальнасці, таму магу падзяліцца практычным вопытам: з якога боку сябе лепш паказваць, як выходзіць са стрэсавых сітуацый, як здымаць мышачныя заціскі, якія перашкаджаюць раскрыцца. Заўсёды кажу, што так вось адразу вас ніхто не навучыць быць вядучым. Гэта бесперапынны працэс пазнання самога сябе плюс самаадукацыя.

— А што самае складанае ў працы на тэлебачанні?

— Тут самае складанае — не спыняцца на дасягнутым. Важна пастаянна развівацца. Нават калі здаецца, быццам ты нечага дабіўся, трэба імкнуцца ісці наперад: запісвацца на нейкія курсы, спрабаваць сябе ў іншых праектах. Ні ў якім разе не спыняцца: маўляў, вось я зрабіў нешта і цяпер магу адпачываць. Тэлебачанне — тая сфера, дзе сёння ваш праект у эфіры, а заўтра яго закрываюць. І ў такіх умовах толькі сапраўдныя фанаты сваёй справы застаюцца ў «абойме».

— А вы можаце, сустрэўшы чалавека, зразумець, зможа ён быць у гэтай прафесіі ці не?

— Калі ты «варышся» ў гэтай сферы, то нават па тым, як вітаецца з табой чалавек пры сустрэчы, можна сказаць, ці чакае яго тэлевізійная будучыня альбо яму прыйдзецца вельмі многа працаваць над сабой. Напрыклад, дзяўчаты часта размаўляюць высокімі галасамі, а ў эфіры гэта недапушчальна. Значыць, трэба голас развіваць, бо некаму прыродай усё дадзена, іншыя ж павінны прыласці нямала высілкаў. Усяго можна дабіцца, калі задачу перад сабой правільна паставіць. Веданне мэты і праца над яе дасягненнем дазваляюць расці.

— Эфір мае на ўвазе пэўны сцэнарый. А як рэагуеце на сітуацыі, калі здараюцца адхіленні ад плана?

— Жывы эфір — тое месца, дзе здараецца шмат нечаканасцяў. Табе можа здавацца, быццам усё будзе класна, калі скажаш тое і зробіш так, а ў працэсе зразумееш: павінна ўсё быць па-іншаму. Трэба ўмець пераключацца, уключаць імправізацыю. Напрыклад, тыя ж жарты ў эфіры — яны нараджаюцца па прынцыпе «тут і зараз». Сцэнарый — гэта добра, але ў галаве павінна быць больш ведаў, каб мог выкруціцца з любой сітуацыі. Калі ёсць уяўленне пра тое, што хочаш сказаць і на чым зрабіць акцэнт, то ўжо не саб'ешся, нават зрабіўшы адступленне. Вялікі талент — умець думаць, імправізаваць і рэагаваць на сітуацыю хутка. Вельмі засмучаешся, калі толькі пасля эфіру ў цябе нараджаецца тое, што хацеў сказаць, як бы мог удала пажартаваць. Праца ў прамым эфіры загартоўвае мысленне, бо рэакцыя на падзеі павінна быць імгненнай. Тэлебачанне — у нейкім сэнсе гульня, дзе трэба трымаць маску, што б ні здарылася. Побач з табой заўсёды працуюць прафесіяналы, якія падстрахуюць, калі раптам нешта пойдзе не па плане.

— А даводзілася ісці і «рабіць настрой» у эфіры, калі самі — не ў настроі?

— У такіх выпадках я заўсёды ведаю, як узняць яго. Існуюць спецыяльныя практыкаванні, якія дапамагаюць механічна актывізаваць нервовую сістэму. Напрыклад, пачынаем расціраць далонь аб далонь з усёй сілай, нібы хочам адтуль іскру здабыць. Спачатку адчуеце цяпло ў далонях, а потым прыліў энергіі. І такога моманту, як усмешка самой сабе ў люстэрку, ніхто не адмяняў. Пачынаеш усміхацца, і ў цябе запальваюцца вочы. Калі бывае сумна, мне дапамагаюць таксама спевы. Не істотна, будзеце вы спяваць дзіцячую песеньку ці нейкую сваю любімую мелодыю. Яшчэ я навучылася мысліць станоўча. Заўсёды дзякую жыццю за магчымасць працаваць у эфіры для сваёй аўдыторыі. У нашай прафесіі нельга заседжвацца. Трэба больш чытаць, глядзець, імкнуцца да ведаў. Калі жывеш у такім рытме, то на сум не застаецца часу. А ўвогуле я імкнуся працаваць так, каб праблемы заставаліся за дзвярыма студыі.

У нашай прафесіі нельга заседжвацца. Трэба больш чытаць, глядзець, імкнуцца да ведаў.

— «Вольга Венская — сэрца і розум эфіру» — гэта водгук слухачоў пра вас. А як вы самі ставіцеся да праяўлення ўвагі з боку аўдыторыі?

— Калі б рэакцыя на тое, што я раблю, наогул адсутнічала, было б над чым задумацца. Бо не існуе нічога горшага, чым абыякавасць. Я даражу ўвагай сваіх слухачоў. Прыслухоўваюся да іх пажаданняў і стараюся здзіўляць іх нечым кожны раз. Аўдыторыя ж раней за цябе адчуе падвох і проста пераключыцца на іншую радыёстанцыю.

Алена ДРАПКО

■ Ведай нашых!

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ МАРАФОН — БЕЗ ПРОМАХАЎ

Чатыры медалі заваявалі на 7-й міжнароднай алімпіядзе па астраноміі і астрафізіцы ў Грэцыі беларускія школьнікі: адзін сярэбраны медаль і тры «бронзы».

З бронзавымі медалямі вярнуліся з Грэцыі выхаванец сталічнай гімназіі № 29 Міхаіл Кукуеў, навучэнец Магілёўскага дзяржаўнага абласнога ліцэя №1 Дзмітрый Саўчанка і навучэнка гомельскай гімназіі № 56 Ганна Паруль. Сярэбраная ўзнагарода — у выпускніцы Ліцэя БДУ Розы Навіцкай. А ва Уладзіслава Арцем'ева, вучня Магілёўскага дзяржаўнага абласнога ліцэя №2, — пахвальны водгук.

3.05, 9.05, 15.05 М/с «Матч-рэванш». Зборнік м/ф «Дзеты, блакітная Папялушка?..». «Гадзіннік з зязюляй». «Заяц Коська і крынічка».
4.00, 10.00, 16.00 М/с «Вялікая энцыклапедыя прыроды». Рускія народныя казкі. «Цудоўны калодзеж». Зборнік м/ф «Хто першы?». «Мы з Шэрлакам Холмсам».
5.00, 11.00, 17.00 Фільм-казка «Ледзяная ўнучка». Зборнік м/ф «Бобік у гасцях у Барбоса». «Марожаны песні».
6.30, 12.30, 18.30 М/с «Легенда пра Зора».
7.00, 13.00, 19.00 «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Жалезныя сябры». «Рукавіца». «Камароў».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.00, 18.30, 2.40 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
10.45, 17.00 Дак. серыял «Паралельны свет».
11.45, 16.00 Дак. серыял «Варажбітка».
12.45, 18.00 Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
13.15 Серыял «Махляры».
14.15 Серыял «Звышнатуральнае».
15.05, 1.30 Серыял «Менталіст».
20.20 Камедыя «Мужчыны ў вялікім горадзе».
22.20, 4.10 Маст. фільм «Бачнасць гневу».
0.30 Серыял «Каліфрэнія».
1.00 Серыял «Кліч крыві».

ТБ1000

5.00 Камедыя «Лары Краўн».
7.00 Меладрама «Святло навокал».
9.00 Камедыя «Харошы хлопец».
11.00 Трылер «Целаахоўнік».
13.00 Камедыя «Каханне і іншыя абставіны».
15.00 «Finding Neverland».
17.00 Драма «Лэдзі».
19.20 Драма «Успамінаючы няўдачніка».
21.25 Драма «Скарб».
23.30 Мюзікл «У рытме сэрца».
1.35 Камедыя «Міс Ніхто».
3.15 Жахі «Жніво».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Камедыя «Аднойчы праз дваццаць гадоў».
7.50 Драма «Матч».
10.00 Баявік «Выкрадальнікі кніг».
12.00 Маст. фільм «Рок».
14.00 Меладрама «Афера».
16.00 Камедыя «Мужчынская жаночая гульня».
18.00 Маст. фільм «На кручку».
20.00 Меладрама «Маскоўскі жыгала».
21.50 Драма «Чужыя».
0.00 Драма «Бубен, барабан».
2.00 Меладрама «Гувернантка».
4.00 Драма «За табой».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 21.00, 1.00, 4.00 Зламыснікі сома.
6.00, 10.00 Мядзведзі востраў Страху.
7.00 Самыя небяспечныя жывёлы.
8.00, 16.00 Паветраныя асы вайны.
9.00, 12.00, 17.00 Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
11.00 Уцёкі.
13.00, 18.00, 23.00 Верталётныя баталіі.
14.00 Вялікія міграцыі.
15.00 Мядзведжы качэўнік.
19.00 Аферысты і турысты.
20.00, 0.00, 3.00 Дзікі тунец.
22.00, 2.00 НЛА над Еўропай.

DISCOVERY

7.00, 16.25 Хлопцы з Юкана.
7.50, 8.15, 12.20, 12.45, 3.05, 3.30 Заводскія будні.
8.40, 20.05 Як гэта ўстроена?
9.10, 20.35, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35, 10.05, 17.20, 17.50 Паляўнічыя на рэліквіі.
10.30 Як уладкаваны Сусвет.
11.25, 3.55 Разбуральнікі легенд.
13.15, 18.15, 0.55 Top Gear.
14.10, 6.05 Аўтамайстэрні.
15.05 Махінатары.
15.30, 5.10 80 спосабаў абагнуць зямны шар.
19.10 Хуткія і гучныя.
21.00 Мэта — бін Ладэн.
22.00 Чаму Оскар Пісторыус забіў нашу дачку?
23.00 Смяротная прыхільнасць.
0.00 Вайна ад першай особы.
1.50 Выкраданне і выратаванне.
2.40 Маланкавыя катастрофы.

СУБОТА, 17 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.10 Меладрама «Вакзал для дваіх».
8.30 Існасць.
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10, 0.00 Серыял «Выратаваць боса».
11.10 Здароўе.
12.10 Усё як трэба!
12.30 Кінааповесць «Пунсовыя ветразі».
14.15 Вакол планеты.
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 «Зорнае жыццё». «Чаго хочуць халасцякі?».
16.20 Каробка перадач.
16.50 Меладрама «Кахаць па-руску-3. Губернатар».
18.35 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
19.15 Камедыя «Сястрычка, дзейнічай».
21.00 Панарама.
21.40 Баявік «Самалёт прэзідэнта».
23.50 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.55 М/ф: «Мільён у мяшку», «Казка пра залатога пеўніка», «Васіліса Прыгожая».
9.10 Фільм-казка «Стары Хатабыч».
10.35 Пазакласная гадзіна.
10.50, 21.05 Тэлебарометр.
10.55 Фантастыка «Ведзьміна гара».
12.55 Пад грыфам «Вядомыя».
13.30 Серыял «Сустрэчная паласа», 1-я і 2-я серыі.
15.35 Дак. серыял «Усе грані вар'яцтва».
16.15 Дача здароўя.
16.55 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
19.15 Ваша лато.
19.55 Латарэя «Пяцёрачка».
20.25 Вышэй, чым дах.
21.00 «КЕНО».
21.10 Хакей. Міжнародны турнір памяці Руслана Салея. «Дынама» (Мінск) — «Спартак».
23.15 Тэніс. Цынцынаці. Жанчыны.

БЕЛАРУСЬ 3

8.00 «Таямніца душы». Ракаў.
8.30 Дзіцячы фільм. «Воля Сусвету». Фантастыка.
9.40 «Дарогі лёсу». Дак. фільм.
10.30 «Магілёў. Усходняя сталіца Беларусі». Дак. фільм.
10.55 «Снег падае і растае...». Фільм-партрэт.
11.40 «Сокал над горадам». Навукова-папулярны фільм.
12.10 «Ад зямлі, ветру і сонца». Навукова-папулярны фільм.
12.40 «Беларускі народны каляндар». Юр'я. Дак. фільм.
13.00 «АРТіШОК».
13.25, 0.45 «Эпоха. Падзеі і людзі». Міхаіл Глінскі: царская кроў.
14.05 «Месца сустрэчы». Канцэрт.
15.25 «Васіль Быкаў. Франтавыя старонкі». Дак. фільм.
16.00 «Шчырыя прызнанні» Дз. Смольскага». Дак. фільм.
16.30 «Сінематыка». Музыка кампазітара Я. Глебава ў беларускім кіно.
17.10 «Пінская флатылія». Дак. фільм.
17.55 «Суседзі». Кітайцы.
18.15 Экранізацыя літаратурных твораў. «Новая зямля». Маст. фільм.
20.30 Калыханка.
20.45 Экранізацыя літаратурных твораў. «Бег ад смерці». Маст. фільм.
22.10 Сусветнае кіно. «Здабыты час». Драма.

АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
9.20 «Здароўе».
10.25 «Смак».
11.05 «Ідэальны рамонт».
12.05 Камедыя «Непагражаны ілгун».
13.30 «Ералаш».
13.55 Серыял «Спадчына».
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 «Адгадай мелодыю».
16.55 «Форт Баярд».
18.25 «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
21.05 «Сёння ўвечары».
22.50 Маст. фільм «Скура, у якой я жыву».
1.00 Камедыя «Хлапечнік».

СТБ

6.20 Серыял «Салдаты. Новы прызыў».
8.00 Камедыя «Пяць маіх былых сябровак».
9.40 «Чыстая праца».
10.30 «100 працэнтаў».
11.00 «Жанчыны XX стагоддзя».
11.30 «Мінск і мінчане».
12.05 «Сакрэтныя тэрыторыі».
13.05 «Прыгоды дылетанта».
13.40 Серыял «Чатыры танкісты і сабака».
14.55 «Ваенная тайна».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.40 «Такі лёс».
18.30 «Дзіўная справа».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 Маст. фільм «Тры метры над узроўнем неба».
22.25 «Зорны рынг». Дайджэст.
23.25 Камедыя «Шосты элемент».
1.10 «Глядзець усім!».

МІР

5.00 Дак. фільм «Галівудскія пары».
6.00 М/ф.
7.35 «Мільён пытанняў пра прыроду».
7.50 М/с «Смяшарыкі».
8.15 «Эксперыментатары».
8.30 «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 «На шашлыкі».
9.40 «Зроблена ў СССР».
10.10, 23.10 Маст. фільм «Салон прыгажосці».
11.45 Серыял «Самара-Гарадок».
15.10 Серыял «Танга з анёлам».
20.45 Серыял «Няўлоўная чацвёрка».
0.45 «Музычны ілюмінатар».
1.15 Маст. фільм «Два жыцці Маціа Паскаля».

СТБ

6.20 Серыял «Салдаты. Новы прызыў».
8.00 Камедыя «Пяць маіх былых сябровак».
9.40 «Чыстая праца».
10.30 «100 працэнтаў».
11.00 «Жанчыны XX стагоддзя».
11.30 «Мінск і мінчане».
12.05 «Сакрэтныя тэрыторыі».
13.05 «Прыгоды дылетанта».
13.40 Серыял «Чатыры танкісты і сабака».
14.55 «Ваенная тайна».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.40 «Такі лёс».
18.30 «Дзіўная справа».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 Маст. фільм «Тры метры над узроўнем неба».
22.25 «Зорны рынг». Дайджэст.
23.25 Камедыя «Шосты элемент».
1.10 «Глядзець усім!».

МІР

5.00 Дак. фільм «Галівудскія пары».
6.00 М/ф.
7.35 «Мільён пытанняў пра прыроду».
7.50 М/с «Смяшарыкі».
8.15 «Эксперыментатары».
8.30 «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 «На шашлыкі».
9.40 «Зроблена ў СССР».
10.10, 23.10 Маст. фільм «Салон прыгажосці».
11.45 Серыял «Самара-Гарадок».
15.10 Серыял «Танга з анёлам».
20.45 Серыял «Няўлоўная чацвёрка».
0.45 «Музычны ілюмінатар».
1.15 Маст. фільм «Два жыцці Маціа Паскаля».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 Маст. фільм «Неідэальная жанчына».
8.40 Маст. фільм «Дзьмухавец».
10.25 «Ранішняя@пошта».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.15 «Суботнік».
11.55 «Гарадок».
12.15 Камедыя «У старых рытмах».
14.15 «Сумленны дэтэктыў».
14.55 «Анатомія кахання. Эва, Пола і Беата».
15.55 Маст. фільм «Прадаецца котка».
18.05 «Суботні вечар».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.30 Маст. фільм «Права на каханне».
23.50 Маст. фільм «Малахольная».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.25 Серыял «Дарожны патруль».
8.00, 10.00, 13.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Іх норавы».
8.55 «Гатуем з Аляксеем Зімніным».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
10.50 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.20 «Следства вялі...».
14.10 «Вочная стаўка».
15.05 «Чыстасардэчнае прызнанне».
15.35, 19.25 Серыял «Мент у законе».
22.55 Серыял «Глухар. Вяртанне».
0.45 Дак. фільм «Кропка незвароту».

8 КАНАЛ

9.00, 14.05, 18.50, 21.00, 23.35 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
9.15 «На рыбалку».
9.30 Драма «Прысяжная».
11.30 «Даведнік па краінах і кантынентах».
11.40 Трылер «Мой анёл-ахоўнік».
13.50 «Кінаблакнот».
14.05 «Надвор'е».
14.10 Драма «У белым палоне».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Фільм — дзецям. Серыял «Прыгоды Шырлі Холмс».
17.30 «Hip Show».
18.00 Серыял «Людзі Альфа».
18.55 Камедыя «Прыгоды рабіна Якава».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Трылер «Тэорыя змовы».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.30 Серыял «Татавы дочкі».
9.30 Скетч-шоу «Адны дома».
10.00, 17.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
10.30, 13.00, 0.00 «Улётнае відэа».
11.00 «Вясельная сукенка».
11.30 «З'ешце гэта зараз жа».
12.00, 20.00, 23.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
12.30, 17.30, 0.30 Скетч-шоу «Анекдоты».
13.30, 21.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 Серыял «Нанакаханне «.
16.00 «Практычная магія».
18.00 «Нерэальная гісторыя».
19.00 «Уральскія пельмені».
22.10 «Кіно ў дэталях».

ІНТЭР+

7.00 Канцэрт М. Паплаўскага.
9.00 Краіна смяецца.
9.15, 16.35, 23.25 Феерыя падарожжаў.
9.35, 22.15 Смартшоу.
10.05 Дак. серыял «Украіна. Забытая гісторыя».
10.50, 22.40 Летняя кухня.
11.35 Серыял «Кантар».
12.25 Маст. фільм «Асабліва небяспечныя».
13.50 Маст. фільм «Ідзі і не азірайся».
15.00, 5.10 Вялікі канцэрт на Інтэры.
17.00, 23.50 Дак. фільм «Эліта спецназа «Крапавыя берэты».
17.30, 0.20 Легенды крымінальнага вышуку.
18.00, 0.50 Агенты ўплыву.
18.35, 1.35 Маст. фільм «Фатаграфіі на сцяне».
20.00, 3.00 Падрабязнасці.
20.30, 3.30 Маст. фільм «Да вас прыйшоў анёл».

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Вясёлая моладзь». 1986 год.
6.20 «Лірычныя песні Мікаэла Тарывердзіева». Фільм-канцэрт.
6.40, 6.55 «Новыя прыгоды Доні і Мікі». Маст. фільм.
8.00, 14.00, 2.00 «Час».
9.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 4.00 Сустрэча ў «Астанкіна» з Андрэем Міронавым. 1978 год.
11.00 «Камуналка». Дак. фільм.
12.00 «Ранішняя пошта». 1985 год.
12.35 «З робатамі не жартуюць». Фільм-спектакль.
15.00 «Колба часу».
16.00 «Кінапанарама». 1970 і 1984 гг.
17.00 «Быў час». 2009 год.
18.10 «Як гэта рабілася ў Адэсе?!». 1988 год.
20.00 «Брава». Канцэрт.
21.00 «Герцагіня Гераль штэйнская». Спектакль.
22.15 «Уладзімір Этуш». Юбілейны вечар у тэатры Вахтангава. 1993 год.
23.00 «Відавочнае — неверагоднае». 1976 год.
0.00 «Оба-на-Угол». 1993 год.
0.40 «Інспектар Лосеў». Маст. фільм.

EUROSPORT

9.30, 13.15, 14.15, 23.00 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
10.45, 1.40 Sports Excellence.
11.00 Хакей на траве. Чэмпіянат Еўропы.
12.30, 20.15, 2.00 Веласпорт. Энека тур.
19.15, 1.45 Лёгкая атлетыка. Грынлайт.
19.30 Скачкі на лыжах. Летні Гран-пры.
21.45 Конны спорт. Global Champions Tour.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 20.05 «Паміж намі».
5.20, 12.55, 21.00 Камедыя «У гадзіну ночы».
5.45, 13.20, 21.25 Камедыя «У парку».
6.00, 7.45, 8.40, 16.45, 21.45, 23.45, 3.05 «Камедыянты. Лепшае».
6.15 Камедыя «Пакаленне 1000 еўра».
8.00, 16.00, 2.25 Камедыя «У гадзіну ночы».
8.25, 16.25, 2.50 Камедыя «У парку».
9.00 Камедыя «Кахаю цябе на ўсіх мовах свету».
11.15 Камедыя «101 далмацінец».
13.45 Камедыя «Чарлі на забаўляльным мерапрыемстве, або Перапалох на танцпляцоўцы».
14.10 Камедыя «Салодкі як мёд».
17.20 Камедыя «Баскетбольная ліханаманка».
19.20 Камедыя «Утаймаванне свавольнага».
22.10 Камедыя «Светлае Раство».
0.10 Камедыя «Сіньёр Рабінзон».
3.25 Камедыя «Пакаленне 1000 еўра».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.00, 4.50 Серыял «Сябры».
9.45 Маст. фільм «Гаспадар мораў».
11.55, 2.40 Маст. фільм «Шклянка вады».
14.15, 1.05 Серыял «Вар'яты».
16.10 М/ф «Ледніковы перыяд 4: Кантынентальны дрэйф».
17.30 Маст. фільм «Маё жыццё».
19.45 Маст. фільм «Аднойчы ў Правінцыі».
21.55 Маст. фільм «Красуня і бадзяга».
23.40 Серыял «Каліфрэнія».
0.15 Серыял «Кліч крыві».

ТБ1000

5.00, 17.10 Драма «Успамінаючы няўдачніка».
7.00 Камедыя «Каханне і іншыя абставіны».
9.00, 21.15 Мюзікл «У рытме сэрца».
11.00 Драма «Чароўная краіна».
12.50 Камедыя «Шчаслівец».
15.00 Драма «Марыя-Антуанета».
19.10 Драма «Дзяўчына ў парку».
23.10 Жахі «Жніво».
1.00 Драма «Апусцелы горад».
3.15 Драма «На краі».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Камедыя «Мужчынская жаночая гульня».
8.00 Маст. фільм «На кручку».
10.00 Меладрама «Гувернантка».
12.00 Драма «Мілы, дарагі, любімы, адзіны...».
14.00 Меладрама «Галасы рыб».
16.00 Меладрама «Мамы».
18.00 Драма «Залатое стагоддзе».
20.00 Меладрама «Розыгрыш».
21.40 Камедыя «Абхазская казка».
0.00 Драма «За табой».
2.00 Камедыя «Пацалунак праз сцяну».
4.00 Драма «Урокі ў канцы вясны».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 11.00 Звяры-тытаны.
6.00, 12.00 Самыя небяспечныя жывёлы.
7.00 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
8.00 Злавіць сома.
9.00 З пункту гледжання навукі.
10.00 У пошуках акул.
13.00 Шаша праз пекла.
14.00 Людаед ракі Конга.
15.00 Дзікая прырода Амерыкі.
16.00 Аўта-SOS.
17.00 Падарожжа на край Сусвету.
19.00 Дзікі тунец.
20.00, 0.00, 4.00 Ліхтугі за мяжой.
21.00, 1.00 Секунды да катастрофы.
22.00, 2.00 Амерыканская калонія.
23.00, 3.00 Расследаванні авіякатастроф.

DISCOVERY

7.00, 17.20 Як гэта ўстроена?
7.25, 16.25 Каралі сутыкненняў.
8.15 Палёты ўглыб Аляскі.
9.10 Паветраныя дальнабойшчыкі.
10.05 Заплыў з пачварамі.
11.00, 6.05 Піраты выратавання.
11.50, 12.20 Паляўнічыя на рэліквіі.
12.45, 20.05, 2.40 Эд Стафард: голае выжыванне.
13.40 Супер'яхты.
14.35, 15.05 Што было далей?
15.30 Хуткія і гучныя.
17.50, 4.45 Як гэта зроблена?
18.15, 0.55 Мэта — бін Ладэн.
21.00 Калі рыба атакуе.
22.00, 3.30 Паўночная Амерыка.
23.00 Лепшы рыбалоў.
0.00 Чаму Оскар Пісторыус забіў нашу дачку?
1.50 Смяротная прыхільнасць.
4.20 Маланкавыя катастрофы.
5.10, 5.40 Каралі аўкцыёнаў.

НЯДЗЕЛЯ, 18 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

7.25 Кінааповесць «Пунсовыя ветразі».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Арсенал.
9.35, 0.20 Серыял «Выратаваць боса».
11.45 Нашы.
12.10 Меладрама «Вакзал для дваіх».
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 Зона Х.
16.00 Камедыя «Жандар на прагулцы».
17.55 «Мая праўда». «Уладзімір Этуш».
18.55 Драма «Сола на саксафоне».
21.00 У цэнтры ўвагі.
21.55 «Радзівілы. Тайны сям'і. Другая серыя».
22.35 Камедыя «Бар «Брыдкі каёт».

БЕЛАРУСЬ 2

7.55 М/ф: «Муха-цакатуха», «Казка пра цара Салтана».
8.55 Фільм-казка «Прынцэса на гарошыне».
10.20 Пазакласная гадзіна.
10.40, 21.10 Тэлебарометр.
10.45 Камедыя «Воднае жыццё».
13.00 Серыял «Сустрэчная паласа», 3-я і 4-я (заключная) серыі.
15.10, 20.00 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
16.55 Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь. «Гомель» — БАТЭ.
19.15 Суперлато.
21.00 «Спортлато 5 з 36».
**21.

Ганна БОЛБАС, першая ў Беларусі жанчына — дырэктар футбольнага клуба:

«ЖАНЧЫНА-ДЫРЭКТАР У ЕЎРАПЕЙСКІМ ФУТБОЛЕ — УЖО ДАЎНО НОРМА»

Здаецца, XXI стагоддзе, мы жывём у эпоху гендарнай роўнасці. Тым не менш любое гучнае прызначэнне жанчыны ў палітыцы, аўтабізнесе, фінансавым свеце і, нарэшце, у спорце суправаджаецца сапраўдным інфармацыйным выбухам. Не стала выключэннем навіна пра 22-гадовую выпускніцу БДУ Ганну Болбас, якая некалькі тыдняў таму ўзначаліла футбольны клуб «Партызан». Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з дзяўчынай, каб даведацца, наколькі моцнай можа быць фанацкая любоў, якія кірункі трэба развіваць у спартыўным маркетынгу і адкуль у беларускага клуба з другой лігі з'явіліся прыхільнікі ў Германіі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

На валанцёрскіх пачатках

— Ганна, раскажыце, калі ласка, як у 22 гады вы сталі ні многа ні мала дырэктарам футбольнага клуба.

— Такое рашэнне было прынята заўзятарамі клуба пасля таго, як былы кіраўнік «Партызана» Леанід Пяткевіч абвясціў пра свой сыход. Некалькі гадоў таму ў мяне з'явіліся сябры сярод фанатаў каманды, я вельмі хутка ўлілася ў калектыў, потым стала дапамагаць хлопцам з дакументамі, арганізацыяй матчаў і іншымі справамі. Мабыць, нядрэнна зарэкамендавала сябе, паколькі заслужыла такі неверагодны давер.

— Што непасрэдна ўваходзіць у вашы абавязкі?

— Перш за ўсё, я адказваю за арганізацыю матчаў. Мая задача — каб сустрэча паміж камандамі адбылася. Гэта ўладжванне ўсемагчымых пытанняў з выездам у іншы горад, адпраўка факсаў у «куткую дапамогу», заключэнне з ёй дагавораў і шмат іншага. Прасцей кажучы, уся дакументацыя каманды — на мне. Акрамя гэтага, безумоўна, пошук спонсараў. Без сур'ёзнай падтрымкі ні адзін футбольны клуб доўга не працягне.

— Напэўна, цяжка быць дырэктарам футбольнага клуба і не мець пэўнай практыкі, добрых сувязяў?

— Што датычыцца вопыту, то я і да назначэння, па сутнасці, выконвала тую ж самую работу, што і зараз. Акрамя гэтага, падчас навучання ва ўніверсітэце ў мяне была досыць плённая практыка ў банку, дзе я і пачала займацца адміністрацыйнай работай, весці дакументацыю, падлік фінансаў і г.д. Футбольны клуб — гэта такое ж таварыства з абмежаванай адказнасцю, як і мільёны іншых, толькі са сваёй спецыфікай. А наконт адсутнасці сувязяў, ведаеце, мне гэта зусім не перашкаджае весці перамовы з высокапастаўленымі людзьмі.

— Акрамя вас, штат клуба «Партызан» зараз — гэта...?

— Яшчэ чатыры чалавекі — два трэнеры, намеснік дырэктара і бухгалтар. Але ёсць людзі, якія працуюць на валанцёрскіх пачатках. Напрыклад, наш прэс-аташэ. Ён таксама выйшаў з прыхільнікаў клуба, а зараз займаецца нашым сайтам, піша агляды турнірных гульняў, робіць фотарэпартажы з матчаў. Мне вельмі радасна ад таго, што ў нашай футбольнай сям'і ёсць людзі, якія абсалютна бескарыслівa дапамагаюць клубу развівацца.

— Ваш муж таксама працуе ў клубе...

— Так. І гэтак жа на добраахвотных пачатках. Ён — масажыст. Скончыў каледж, адпрацаваў па размеркаванні, зараз мае асобную працу, але па-ранейшаму застаецца ў клубе, бо ведае, што тут ён вельмі патрэбны.

Упяцярых — на пяці «квадратах»

— Відавочна, у такіх умовах адчуваецца кадравы голад. Якіх спецыялістаў вам не хапае ў першую чаргу?

— Шчыра кажучы, шмат каго не хапае. Добра б было мець яшчэ аднаго офіс-менеджара, які б дапамагаў з дакументацыяй. А яшчэ лепш — уласнага піяр-спецыяліста, які б змог зрабіць паўнавартасны бізнес-план, прапрацаваць стратэгію па прасоўванні клуба. Я разумею, наколькі гэта важная для футбола галіна, у якой трэба быць прафі, каб быў нейкі эфект. Але калі не знойдзем такога спецыяліста, значыць, буду сама навучацца гэтаму рамяству. Што ж рабіць (*усміхаецца*). А ўвогуле і гэта другараднае! Нам бы добры офіс знайсці. Зараз мы здымаем маленечкае памяшканне ў гандлёвым цэнтры «Сілуэт». Упяцярых месцімся як можам на пяці квадратных метрах. Але з-за нязручнасці часцей за ўсё мы на нагах, лётаем па горадзе і падтрымліваем з уісмі сувязь па тэлефоне.

— Праблема з арэндай офіса фінансавага плана?

— Збольшага, безумоўна. Ведаеце, за гэтыя пяць «квадратаў» мы плацім 350 долараў у месяц. Бы яшчэ 50 долараў за камунальныя паслугі! А камунальныя паслугі — гэта толькі электрычнасць і прыбіранне памяшкання. Прыбіральня, напрыклад, усё роўна платная. Грошы грашыма, але знайсці слушнае месца на дзесяці квадратных метрах у цэнтры горада зусім не проста. Пакуль сама з гэтым не сутыкнулася, не магла і ўявіць, што можа існаваць такая праблема.

— Ведаю, былі складанасці з арэндай футбольнага поля для трэніровак. Сітуацыя не змянілася?

— У апошнія дні якраз займаюся гэтым пытаннем. Нам выдзяляюць адзін футбольны стадыён у Фрунзенскім раёне. Аб'ект знаходзіцца, мякка кажучы, не ў лепшым стане, але прапанаваныя ўмовы — шэфства над стадыёнам узамен базы для трэніровак — нас задавальняюць. Нашы фанаты гатовы самі нешта там фарбаваць, рамантаваць, толькі б іх любімая каманда мела месца для трэніровак. Было б нядрэнна паслаць там штучнае пакрыццё, але ж гэта каштуе вялікіх грошай. Тым не менш, калі гэта зрабіць, карысць будзе не толькі нам, але і ўсяму раёну. Поле можна будзе выкарыстоўваць у інтарэсах спартыўных школ, а таксама здаваць у арэнду звычайным грамадзянам. Зноў-такі — які-ніякі прыбытак.

Унікальная еднасць

— Вас не крыўдзіць, калі чуеце, што ваша каманда аматарская ці паўпрафесійная?

— Я і сама часта кажу, што мы — паўпрафесіяналы. Але гэта датычыцца толькі працоўнага статусу футбалістаў. Яны ж у нас не атрымліваюць зарплату. У астатнім — гэта прафесійныя гульцы, якія амаль усё сваё свядомае жыццё прысвяцілі футболу. Хлопцы маюць пашпарты футбалістаў, іх у любы момант можа купіць другі футбольны клуб.

— Для тых, хто ніколі не чуў і не чытаў пра клуб «Партызан», раскажыце, калі ласка, хто тыя хлопцы, якія выступаюць за каманду.

— Наша дружына — вельмі маладая. Гэта ў асноўным футбалісты 1994-1995 гадоў нараджэння. Хтосьці ўжо працуе, хтосьці яшчэ вучыцца. Ведаю, што многія хлопцы зараз працуюць на будоўлі, каб зарабіць сабе на летні адпачынак і не сядзець у бацькоў на шыі. Разумееце, ва ўсіх сваё жыццё: праца, вучоба, сям'я, нейкія іншыя захапленні. Але, акрамя ўсяго гэтага, ёсць яшчэ адна мара — займацца любімай справай, гуляць у футбол. І хлопцы робяць усё для таго, каб каманда не толькі існавала, а актыўна дзейнічала і перамагала.

— Разумею, што лепш адзін раз пабачыць, чым сто разоў пачуць, але ўсё ж такі апішыце на словах унікальнасць фанатаў «Партызана». Адкуль такая сур'ёзная заўзятарская падтрымка ў клуба з другой лігі?

— Істотная частка арміі фанатаў засталася з часоў МТЗ-РІПО. Трэба разумець, што хоць «Партызан», па сутнасці, новы клуб, з іншымі футбалістамі і кіраўнікамі, але ад гэтага ён не пазбавіўся сваёй багатай гісторыі і традыцый. У большасці футбольных клубаў заўзятарская падтрымка прама прапарцыянальная спартыўным дасягненням і поспехам на полі. Каманда перамагае — ёсць аддача ад фанатаў, перастае перамагаць — аддача ад фанатаў знікае. Нашы ж заўзятары любяць не за штосьці, а насуперак. Інакш бы яны не змаглі адрадзіць клуб тады, калі яго ўжо спісалі з рахункаў, і дапамагаць яму заставацца на плаву зараз, усялякі раз арганізоўваючы збор сродкаў на тыя ці іншыя патрэбы. Акрамя гэтага, фанатаў «Партызана» аб'ядноўвае і аднолькавае стаўленне да жыцця, агульныя прынцыпы і ідэі. Нашы заўзятары адкрыта выказваюцца супраць расавай, рэлігійнай і іншай дыскрымінацыі. Не памылюся, калі скажу, што такая ідэалагічная еднасць фанацкай супольнасці — унікальная не толькі для Беларусі, але і для астатніх краін СНД.

— Можаце намаляваць вобраз сяроднестатыстычнага фаната «Партызана»?

— Не. Сярод нашых самых адданых заўзятараў ёсць і сталыя людзі, і дзесяцідванаццацігадовыя хлопчыкі, якія не прапускаюць ніводнай гульні каманды. Гэта і рэспектабельныя бізнесмены, якія пачыналі «хварэць» за клуб, калі самі яшчэ былі галоднымі студэнтамі, а зараз яны маюць магчымасць дапамагаць нам фінансава. Гэта і людзі са звычайным дастаткам, навучэнцы тэхнікумаў, каледжаў, вучылішчаў. Ёсць у нас і замежныя прыхільнікі — у многіх краінах Еўропы і нават у Лацінскай Амерыцы! Прычым гэта не выхадцы з Беларусі, а мясцовыя жыхары, якія сочаць за лёсам клуба па інтэрнэце. Напрыклад, у каманды сур'ёзная група падтрымкі ў Германіі. Гэта перш за ўсё на фоне антынацысцкага руху. Так, нядаўна нашы нямецкія сябры арганізавалі для каманды тур па Германіі, падчас якога футбалісты правялі некалькі матчаў з рознымі мясцовымі клубамі. Для нядрэнна паслаць там штучнае пакрыццё, але ж гэта каштуе вялікіх грошай. Тым не менш, калі гэта зрабіць, карысць будзе не толькі нам, але і ўсяму раёну. Поле можна будзе выкарыстоўваць у інтарэсах спартыўных школ, а таксама здаваць у арэнду звычайным грамадзянам. Зноў-такі — які-ніякі прыбытак.

— А яшчэ ёсць Каралін Стыл, якая спачатку зрабіла кар'еру ў фэшн-індустрыі, а потым узначаліла футбольны клуб у другой англійскай лізе. А пасля ўвогуле выйшла замуж за ўладальніка гэтага клуба.

— Гэта ўжо, вядома, крайнасці (*усміхаецца*).

— І, напэўна, складана пазбегнуць параўнанняў з прэзідэнтам маскоўскага «Лакаматыва» Вольгай Смародскай...

— Так. Але зноў-такі, у яе канфлікт інтарэсаў з фанатамі. Мяне ж заўзятары самі абралі на гэту пасаду.

— Увогуле, як ставіцеся да яе дзейнасці ў «Лока»?

— Мне здаецца, на камандзе яна проста робіць бізнес. Зарабляць на футболе грошы — можна, але рабіць гэта, адгароджваючыся ад заўзятараў, — вялікая памылка. Я была, мякка кажучы, вельмі здзіўлена, калі даведалася, што з-за сутычак з фанатамі Смародская часова забараніла продаж білетаў на гульні каманды. Нейкая абсалютна алагічная дысцыплінарная мера. Здаецца, чалавек увогуле не разумее, наколькі важнай, калі не сказаць неад'емнай, часткай футбольных рэалій з'яўляецца фанацкая супольнасць. Быў такі паказальны момант, калі на адной з сустрэч з заўзятарамі Смародская праліла ваду на стол і не знайшла лепшага варыянта, чым выцерці лужыну клубным шалікам. Адно неасцярожнае дзеянне — і адразу здымаюцца ўсе пытанні.

— Яшчэ яе крытыкуюць за актыўнае ўмяшальніцтва ў трэніравальны працэс. Вы для сябе неяк падзяляеце адміністрацыйную работу і тое, што адбываецца на полі?

— Не сказаць, што падзяляю, але розніцу паміж гэтымі пластамі работы разумею. Час ад часу я прысутнічаю на трэніроўках у хлопцаў, назіраю за падрыхтоўкай збоку, але не памятаю, каб была неабходнасць карэктаваць дзеянні трэнераў, нешта падказваць. Безумоўна, калі, напрыклад, узнікнуць праблемы па дысцыпліне, якія будуць замінаць працоўнаму працэсу, я буду абавязана ўмяшацца. Бо мая задача — давесці футбаліста да трэнера: зрабіць так, каб ён прыходзіў на трэніроўкі, рыхтаваўся да матчаў, своечасова з'яўляўся на выезды і г.д. Але ж гэта форс-мажорныя сітуацыі. У астатнім, як я ўжо казала, у мяне зусім іншая работа.

— Згодны, што жанчыне, мабыць, і лягчэй знайсці спонсараў у бізнесе?

— Мне здаецца поспех справы не залежыць ад таго, жанчына ты ці мужчына. Калі ты ўвесь такі ганарлівы і не ў тваіх прынцыпах хадзіць па кабінетах прасіць падтрымкі, тут ужо не мае значэння твая палавая прыналежнасць, пагадзіцеся. Важна быць прафесіяналам у сваёй галіне, умець гэта прадэманстраваць, зацікавіць патэнцыяльнага спонсара. Іншая справа, што падчас дзелавых стасункаў да дзяўчыны могуць ставіцца мякчэй, далікатней.

— Працуючы на такой прэстыжнай пасадзе, ды яшчэ і сярод мужчын, стараецеся неяк асабліва сачыць за сваім знешнім выглядам?

— Ведаеце, тут я ў поўнай збянтэжанасці. З аднаго боку, я, як кіраўнік, я павінна выглядаць адпаведна — дзелавы стыль адзення, пінжачкі, туфлікі. Але калі я буду ўвесь час бегаць на абцасах, не змагу быць такой мабільнай. З іншага боку, як чалавек, што працуе ў спартыўнай сферы, я магу аддаць перавагу футболкам і кедам, і гэта будзе цалкам натуральна. Напэўна, буду чаргаваць. У гэтым ёсць свой плюс.

Кавярня для фанатаў, арт-хаус і бела-чырвоная расфарбоўка

— Вы неяк адзначалі, што да таго, як сталі дырэктарам «Партызана», мала чаго ведалі пра беларускі футбольны чэмпіянат. Мабыць, ужо атрымалася нешта асэнсаваць, прыйсці да пэўных вынікаў?

— Так і ёсць, пра беларускі футбол не ведала амаль нічога. Ведала, што ў маім родным горадзе Бабруйску ёсць свая каманда «Белшына», чула нейкія навіны з вышэйшай лігі, якія мільгалі на тэлебачанні. Але не думала, што ў Беларусі такая вялікая колькасць прафесійных футбольных клубаў. І тым больш не магла ўявіць, што ў нас магчымы сур'ёзны фанацкі рух, аж да ўзроўню прымання-непрымання каманды-саперніка. Вядома, да гэтага глядзела нейкія сюжэты пра беларускіх футбольных заўзятараў, але глядзець і апынуцца самой у гэтым асяроддзі — зусім розныя рэчы. А яшчэ зразумела, што ў беларускім футболе недастаткова развіта праца з фанатамі. Акрамя, так бы мовіць, ідэалагічнай функцыі — на гэтым жа можна зарабляць грошы! Але зразумейце: грошы не сабе ў кішэню, а на развіццё клуба. Продажу фанацкай атрыбутыкі ўжо недастаткова. Трэба шукаць іншыя кірункі дзейнасці. Напрыклад, у Германіі многія футбольныя клубы маюць уласныя піўныя бары, дзе збіраюцца прыхільнікі той ці іншай каманды, глядзяць матчы з яе ўдзелам ці проста дзеляцца навінамі і разам бавяць час. Вось я і падумваю: чаму б нам, дапусцім, не адкрыць сваю кавярню? Нашы заўзятары ўсё роўна бываюць у падобных месцах, а так можна і прыемна бавіць час у сяброўскай атмасферы, і фінансава падтрымаць сваю каманду. У нас жа такога пакуль няма ці толькі з'яўляюцца першыя спробы. Так, у хакейнага клуба «Дынама-Шыннік» у Бабруйску ёсць уласная чайная крама. Але ж гэта кропля ў моры.

— Якое ваша самае вялікае захапленне пасля працы і футбола?

— Я — кінаманка. Часцей люблю глядзець арт-хаўснае кіно, ці, як зараз прынята казаць, «кіно не для ўсіх». Для мяне гэта не даніна модзе — проста люблю фільмы, пасля прагляду якіх можна паразважаць. Многія не разумеюць такіх стужак. Напрыклад, калі я раю сваім сябрам нешта з гэтай оперы, яны мне часам кажуць: «Што ты нам падсунула?». А мне падабаецца небанальнае і стыльнае кіно. Але часцей за ўсё такія фільмы вельмі цяжкія для ўспрымання, таму, зразумела, не заўсёды ёсць настрой глядзець іх. Тады ўключаю блокбастары — я гэтую з'яву называю «папкорнавае» кіно. Прыйшоў дадому, паглядзеў такую карціну і лёг спаць без лішніх думак у галаве.

— Апошні незвычайны, але цікавы фільм, які давялося паглядзець?

— Што б такое вылучыць... Напэўна, «Фантан» Дарэна Аранофскі. Вельмі моцны фільм. Яго, напэўна, трэба неаднойчы праглядваць, каб нарэшце зразумець аўтарскую ідэю.

— Падзяліцеся сваімі першымі свядомымі ўспамінамі пра футбол, яшчэ з «дапартызанскага» перыяду?

— Памятаю, што мае дзядуля і тата ўсё жыццё «хварэлі» за «Спартак». Напэўна, таму я досыць халаднавата стаўлюся да «Дынама». Чырвона-белая расфарбоўка была мне заўсёды бліжэй, чым сіне-белая. Таму калі я апынулася ў «Партызане», зразумела, што гэта лёс (*усміхаецца*).

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

ФК «Партызан» (Мінск) быў заснаваны ў 2002 г. і да 2009 г. меў назву «МТЗ-РІПО».

Двойчы ўладальнік Кубка Беларусі (2004/2005, 2007/2008) і двойчы бронзавы прызёр чэмпіянату краіны (2005 г., 2008 г.)

У 2004-2006 гг. каманду трэніраваў вядомы беларускі трэнер Юрый Пунтус.

У канцы 2011 г. клуб застаўся без галоўнага спонсара, а ў пачатку 2012 г. адмовіўся выступаць у вышэйшым дывізіёне з-за адсутнасці фінансавання. У гэты ж час заўзятары мінчан пачалі акцыю па зборы сродкаў для захавання футбольнага клуба.

29 сакавіка 2012 г. «Партызан» атрымаў статус таварыства з абмежаванай адказнасцю. Зараз клуб фактычна знаходзіцца на добраахвотным фінансаванні сваіх заўзятараў.

17 ліпеня 2013 г., пасля сыходу дырэктара «Партызана» Леаніда Пяткевіча, новым кіраўніком клуба была прызначана Ганна Болбас.

Каманда выступае ў другой лізе Беларусі па футболе.

БЛІЦ:

Я баюся... неразумення.
Я ведаю, што... усё будзе добра.
Я не люблю... самахвальства, склочніцтва і скандальнасць.
Я люблю... сваіх бацькоў, сяброў і блізкіх людзей.
Жыццё — гэта пазнанне сябе і навакольнага свету.
Каханне — гэта пазнанне таго, хто побач.
Калі кветкі, то... чым прасцей, тым лепш. Рамонкі!
Калі гарбата, то... зялёная, з мятай, лімонам і цукрам.
Калі танцаваць, то... так, быццам цябе ніхто не бачыць.
Калі плакаць, то... у сабе.
Я вырашыла, што... у мяне ўсё атрымаецца

З Днём будаўніка!

ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ!

Будаўнічая галіна, да якой адносіцца і наш трэст, з'яўляецца адной з самых важных у развіцці эканомікі краіны і росце дабрабыту людзей. І цалкам заканамерна, што праца будаўнікоў ва ўсе часы карысталася і карыстаецца заслужаным прызнаннем, што яна лічыцца самай мірнай, самай ганаровай, самай стваральнай.

Будаўнікі, вобразна кажучы, удыхаюць жыццё ў заводы і фабрыкі, школы і бальніцы, дзіцячыя садкі і фізкультурна-аздараўленчыя комплексы. Іх важкі ўклад у развіццё эканомікі, будаўніцтва камфортнага жылля цяжка пераацаніць, што яскрава відаць на прыкладзе нашага калектыву. З пачуццём асаблівага гонару я сёння адзначаю, што трэст № 40 з часу свайго існавання пабудаваў палову Жлобіна, дзякуючы чаму горад на Дняпры пашырыў свае межы, павялічыў вытворчыя магутнасці, папрыгажэў.

Сённяшні наш калектыў — гэта спалучэнне мудрасці і вопыту старэйшых працаўнікоў, энтузіязму і энергіі моладзі. Гэта адданасць любімай справе, высокі прафесіяналізм, нацэленасць на ўзяцце новых вышынь. Ад усяго сэрца дзякую ўсім за ўдарную працу! Зычу моцнага здароўя, шчасця, сонечнага настрою, матэрыяльнага дастатку, упэўненасці ў заўтрашнім дні. Са святам, дарагія таварышы!

Юрый КАЗЛОЎ, кіраўнік ААТ «Будаўніча-мантажны трэст № 40».

УНП 400076022



Шаноўных калег віншую з прафесійным святам —

ДНЁМ БУДАЎНІКА!

Кожны з вас вылучаецца высокім прафесіяналізмам і адказнасцю. Без гэтага немагчыма ўявіць будаўніцтва самых розных аб'ектаў раённага, абласнога і рэспубліканскага прызначэння. Сёння на нашым прадпрыемстве назапашаны адмысловы вытворчы вопыт, выкарыстоўваюцца новыя будаўнічыя тэхналогіі, аднак самым важным складнікам застаецца высокая кваліфікацыя і адказнасць кожнага з вас, зладжанасць дзеянняў паміж падраздзяленнямі. На нашым прадпрыемстве заўсёды рады вітаць маладых спецыялістаў, гатовых асвойваць прафесію будаўніка.

Са святам, дарагія сябры! Няхай пабудаванае вамі даўжэй служыць людзям, у вашых сем'ях пануе дабрабыт, у душы будзе лад, а ў кішэнях — грошы. Здароўя, шчасця, вернасці абранай справе!

З павагай, начальнік УП «Драгічынская ПМК-8» Валерый ПЕДЗІЧ.

УНП 200098608

■ Што на талерцы?

КАРЫСНЫ БУТЭРБРОД ТАЛІЮ НЕ ПАВЯЛІЧЫЦЬ

Бутэрброд — гэта хутка, лёгка і вельмі зручна, асабліва калі вы ў дарозе або ў офісе. Але дабаўленне ў бутэрброд сыру, маянэзу і іншых тлустых начынак можа ператварыць яго ў каларыйную бомбу. На шчасце, вам не трэба адмаўляцца ад зручнага і простага спосабу здаволення голаду. Прапануем вам некалькі простых рашэнняў, якія зробяць ваш бутэрброд карысным.

❍ «Бутэр» у перакладзе з англійскай азначае «масла». Усе прывыклі выкарыстоўваць у бутэрбродзе сметанковае масла. Але для таго, каб не абцяжарваць наш бутэрброд лішнімі калорыямі, можна прыправіць хлеб не маслам, а аліўкавым алеем.

❍ Выбіраючы хлеб для свайго бутэрброда, замест звычайнага батона вазьміце зерневы хлеб, хлябец або лаваш. А можна і зусім замяніць хлеб лісцем салату, у якое з такім жа поспехам можна «ўпакаваць» любімую начынку.

❍ Абысціся без каўбасы цалкам рэальна! Кавалачак курынай грудкі, мяса індычкі або ялавічыны цудоўна заменяць яе. Мяса для такога бутэрброда можна прыгатаваць у духоўцы, скласці ў пластыкавы кантэйнер і паставіць у халадзільнік. Там яно можа захоўвацца некалькі дзён, і вам будзе лёгка ім карыстацца .

❍ Каб разнастаіць смак бутэрброда, можаце смела камбінаваць начынку з мяса або рыбы не толькі з лісцем салату, але і з яблыкамі, авакада, вінаградам, курагой, арэхавым маслам, бананамі. Паспрабуйце і ацаніце пікантнасць смаку.

❍ Яшчэ адзін сакрэт здаровага бутэрброда — вялікая колькасць зяленіва. Падыдуць лісце салату, пятрушка, кроп. Яны стымулююць выпрацоўку страўнікавага соку і ферментаў, а яшчэ будуць добра спалучацца з бужанінай і індычкай у якасці начынкі.

❍ Калі вы з цяжкасцю ўяўляеце бутэрброд без кавалачка сыру, паспрабуйце замяніць цвёрды сыр на нізкакаларыйную мацарэлу або падобны паўцвёрды нятлусты сыр. Апошні вырабляецца з абястлушчанага малака, таму ў ім менш калорый.

❍ Вы можаце выкарыстоўваць лёгкія сырныя або творожныя намазкі для вашага бутэрброда. Але ўважліва чытайце надпіс на ўпакоўцы. Не выбірайце прадукт, выраблены з пальмавага тлушчу. На нашай упакоўцы павінна быць пазначана «малочна-раслінны» або «малакозмяшчальны» прадукт.

❍ Нягледзячы на тое, што гарачае значна карысней, чым «сухамятка», у нас не той выпадак. Хлеб лепш загадзя крыху падсушыць у тостары, а вось запякаць бутэрброды не трэба. Гэта смачна, але не заўсёды карысна.

❍ Для тых, хто любіць дэсертныя бутэрброды (напрыклад, хлеб з варэннем), таксама ёсць свая альтэрнатыва. Варэнне вы можаце замяніць узбітымі ў блендары замарожанымі або свежымі ягадамі. З імі добра будуць спалучацца бананы, сухафрукты, і гэта значыць, што наш бутэрброд будзе паўнацэнным дэсертам.

❍ Вельмі важна не толькі выбраць здаровыя інгрэдыенты, але і з'есці бутэрброд правільна. Не варта есці на хаду, бегаючы па кухні.

Няхай замена каларыйнай начынкі на больш карысную стане вашым першым крокам да здаровага харчавання. Галоўнае, выконваць асноўнае правіла бутэрброда — запіваць яго чаем, а не заядаць іншымі стравамі. Тады вы зможаце і лёгка ўстаць з-за стала, і лёгка датрываць да чарговага прыёму ежы.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ

БУТЭРБРОД З ЧАРНІЦАМІ НА СНЯДАНАК

Вам спатрэбіцца: *1 банан, 250 г чарніц, 200 г тварагу, 4 кавалачкі хлеба (з семачкамі або грэцкімі арэхамі), 1 ст. л. мёду (вадкага).*

Парэзаць банан, пакласці ў міску з чарніцамі. Дадаць тварог і перамяшаць. Падсушыць кавалачкі хлеба і намазаць чарнічнай сумессю. Папырскаць вадкім мёдам і адразу ж есці.

■ Факт

«Беларусь 5» шукае «спартыўныя» кадры

Белтэлерадыёкампанія аб'яўляе аб пачатку правядзення кастынгу спартыўных журналістаў і каментатараў для новага тэлеканала «Беларусь 5». Заяўкі ад таленавітых, харызматычных і мэтанакіраваных людзей, якія ведаюць і любяць спорт, будуць прымацца да 2 верасня.

Для ўдзелу ў конкурсе неабходна запоўніць анкету, узор якой можна знайсці на старонцы дырэкцыі спартыўнага вяшчання ў раздзеле «Кастынг» на www.tvr.by. Разам з анкетай канкурсанты павінны даслаць свае матэрыялы на папяровым носьбіце альбо DVD, а прэтэндэнты на месца каментатараў могуць дасылаць арганізатарам DVD з пробным запісам каментарыя спартыўнага спаборніцтва працягласцю не больш за паўгадзіны.

Усе матэрыялы дасылайце на адрас: 220807, г. Мінск, вул. Макаёнка, 9 ці на e-mail: sport@tvr.by, але не забудзьце пазначыць «Кастынг спартыўных журналістаў», «Кастынг каментатараў».

Алена ДРАПКО

Мары з водарам кветак

Мінскі фестываль кветнікаў і ландшафтнай архітэктуры завяршыўся ў сталіцы. У ім прынялі ўдзел каманды падраздзяленняў унітарнага прадпрыемства «Мінскзелянбуд». Сталічныя азеляніцелі на працягу амаль двух тыдняў ствараліі кветнікі на тэму «Мар і фантазій смелы палёт». Да позняй восені мінчане і госці сталіцы змогуць пагуляць па скверы «Старобінская слабада», што знаходзіцца недалёка ад гасцініцы «Беларусь», і палюбавацца прыгожымі «жывымі» кампазіцыямі.

Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.

VIASAT NATURE даў імя лісяняці

Завяршыўся конкурс «Дай імя лісяняці», які тэлеканал VIASAT NATURE праводзіў у Мінску ўвесь ліпень

У пачатку ліпеня на вуліцах горада з'явіліся незвычайныя аўтамабілі, цалкам пакрытыя зялёнай травой. Такім чынам тэлеканал VIASAT NATURE вырашыў пачаць конкурс «Дай імя лісяняці». На працягу месяца на вуліцах горада каля «травамабіляў» раздаваліся лістоўкі, якія распавядалі пра акцыю, у эфіры тэлеканалаў Viasat і на радыёстанцыях трансляваліся рэкламныя ролікі. Кожны ахвотны мог прапанаваць імя для чорна-бурага лісяняці, якое нядаўна нарадзілася ў Мінскім заапарку. Усе варыянты публікаваліся на старонцы конкурсу ў сетцы «Вконтакте» vk.com / lisenokminsk, дзе праходзіла галасаванне за лепшае імя. 5 жніўня з 10 варыянтаў, якія набралі найбольшую колькасць галасоў, журы тэлеканала VIASAT NATURE і Мінскага заапарка выбрала імя для маленькага лісяняці — Рэнар. А пераможца атрымаў галоўны прыз конкурсу — LCD-тэлевізар.

Сяргей КУРКАЧ.

Уважаемые акционеры ОАО «Рапс» УНП 600068480

21 августа 2013 года состоится внеочередное общее собрание акционеров

ОАО «Рапс»,

расположенного по адресу: Минская обл., Минский район, 223014, аг. Крупица.

Собрание пройдет по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, административное здание ОАО «Рапс», первый этаж, актовый зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. О даче согласия на реструктуризацию задолженности.
2. Об упразднении фонда потребления.
3. О продаже жилых домов (квартир), построенных (реконструированных, приобретенных) с привлечением льготных кредитов, полученных в открытом акционерном обществе «Белагропромбанк».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, ОАО «Рапс» (бухгалтерия) с 12 по 20 августа 2013 года (время работы с 14.00 до 16.00) либо 21 августа 2013 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 21 августа 2013 г., в 11.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 12 августа 2013 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке!

Справки по тел. 8(017)5069211, 8(017)5069341.

Извещение о проведении 12 сентября 2013 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ООО «БЕЛКАСПИСТРОЙ»

Предмет торгов № 1 – здания и сооружения бывшего оздоровительного лагеря «Солнечный круг» (сведения о продаваемом имуществе)

